**Прымачук Леанід Платонавіч** - вучоны-матэматык, кандыдат фізіка-матэматычных навук (1970), дацэнт (1980). Нарадзіўся 13 жніўня 1943 г. у в. Мацы Кобрынскага раёна. У 1960 г. закончыў Стрыгаўскую сярэднюю школу і паступіў на матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ). У БДУ працаваў з 1967 па 2008 гг. на пасадзе малодшага навуковага супрацоўніка, асістэнта кафедры матэматычнага аналізу, дацэнта кафедры тэорыі функцый, намесніка дэкана. З 1985 па 1996 гг. Леанід Платонавіч - дэкан механіка-матэматычнага факультэта. Апублікаваў звыш 50 навуковых і навукова-метадычных прац.

**Прымачук Леанід Платонавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Знаменитые земляки** // Открытое акционерное общество «Стригово» / [автор текста Е. Жук ; главный редактор В. Шпарло ; фото А. Рыбачука, Г. Козловского]. - Брест, 2021. – С. 20-21. : ил., цв. ил., портр.

**Прымачук Леанід Платонавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 116-117.

### *125 гадоў з дня нараджэння П. І. Ратайкі (1898)*

**Ратайка Пётр Іванавіч** (1898–1982) - дзяржаўны дзеяч БССР. Нарадзіўся 13 студзеня 1898 г. у в. Пескі Кобрынскага павета Гродзенскай губерні (цяпер Кобрынскі раён Брэсцкай вобласці). У 1938-1955 гг. выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Узнагароджаны 6 ордэнамі і медалямі. 6 снежня 1967 г. Ратайка Пятру Іванавічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Гродна».

**Ганаровыя** грамадзяне горада Гродна ў пасляваенны перыяд. Ратайка Пётр Іванавіч // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка горада Гродна. – Мінск, 1999. – С. 683. – (З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны).

**Долготович, Б. Д.** Романюк Иван Леонтьевич / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 204-205.

**Плешавеня, А. М.** Першы старшыня / А. М. Плешавеня // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка горада Гродна. – Мінск, 1999. – С. 330, 331. – (На крутым павароце гісторыі).

**Ратайка Пётр Іванавіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. - Мінск, 1972. – Т. 9. – С. 132.

**Ратайка Пётр Іванавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі : інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 72-73. : каляр. іл.

### *110 гадоў з дня нараджэння Г. М. Рыфера (1913)*

**Рыфер Генрых Мельхіёравіч** (1913–1979). Нарадзіўся 24 верасня 1913 г. у в. Вальрот (у наваколлі г. Касель, Германія). У 1942 г. у складзе акупацыйнай арміі прыбыў у Кобрынскі раён, служыў у ахове чыгункі, дзяжурным на станцыі Лясы на лініі Жабінка - Баранавічы. Партызаны наладзілі з ім сувязь, і па заданні атрада імя Чапаева Г. М. Рыфер арганізоўваў крушэнне цягнікоў, перадаваў партызанам боепрыпасы, звесткі аб руху цягнікоў. За ўдзел у антыфашысцкай барацьбе ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Пасля вайны жыў у Кобрыне.

**Рыфер Генрых Мельхіёравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 224-225 - (Змагаліся ў тыле ворага).

### *85 гадоў з дня нараджэння А. Ф. Свідуновіча (1938)*

**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** (1938–2008) - кандыдат багаслоўя. Нарадзіўся 7 студзеня 1938 г. у в. Дзівін Кобрынскага раёна**.** З 1988 г. Аляксандр Свідуновіч - настаяцель Свята-Мікалаеўскага сабора, благачынны цэркваў г. Днепрадзяржынска. Яго заслугі былі адзначаны мноствам царкоўных і дзяржаўных узнагарод. 8 снежня 2008 г. А. Ф. Свідуновіч памёр.

**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Гапанович, А. Н.** Александр Федорович Свидунович / Афанасий Гапанович // Дивин — древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 76. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні **:** гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 46.

**Свідуновіч Аляксандр Фёдаравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 120-121.

**Слоневский, А**. Протоиерей Александр Федорович Свидунович / Александр Слоневский [Электронный ресурс] // Українська православна Церква. Храм преподобного Сергія Радонєжського – Режим доступа: http://stsergiydndz.-wixsite.com/library/slonevsky-prot-a-svidunovich. – Дата доступа: 04.10.2017.

### *100 гадоў з дня нараджэння В. Р. Селіванюка (1923)*

**Селіванюк Васіль Раманавіч** (1923–2002). Нарадзіўся ў 1923 г. у г. Высокае Камянецкага раёна. Заслужаны меліяратар (1973). Працаваў машыністам гусенічнага крана ПМК-52 Кобрынскага раёна. У 1973 г. прысвоена ганаровае званне «Заслужаны меліяратар Беларускай ССР».

**Селіванюк Васіль Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Селіванюк Васілій Рыгоравіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 102. : фат.

### *100 гадоў з дня нараджэння В. П. Сёміна (1923)*

**Сёмін Вячаслаў Паўлавіч** нарадзіўся ў 1923 г. у Маскве. У Вялікую Айчынную вайну служыў начальнікам радыёстанцыі 2-га стралковага батальёна 37-га гвардзейскага Кобрынскага пяхотнага палка. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Сёмін Вячаслаў Паўлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 238 - (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *100 гадоў з дня нараджэння П. П. Сігорскага (1923)*

**Сігорскі Павел Пятровіч** (1923–1996). Нарадзіўся 29 чэрвеня 1923 г. у г. Кобрыне. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Удзельнічаў у вызваленні Варшавы, штурме Берліна. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, Славы ІІ ступені, медалямі. Памёр 23 сакавіка 1996 г.

**Сігорскі Павел Пятровіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 239 - (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *100 гадоў з дня нараджэння Я. Я. Сілюка (1923)*

**Сілюк Якаў Якімавіч** нарадзіўся ў 1923 г. у в. Ягалкі. У гады Вялікай Айчыннай вайны быў сувязным, байцом партызанскага атрада імя Фрунзе брыгады імя Сталіна. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны працаваў старшынёй Пецькаўскага, Яроміцкага сельсаветаў, інструктарам Кобрынскага райкама партыі, старшынёй калгаса «Праўда» Кобрынскага раёна.

**Сілюк Якаў Якімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 225-226. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *50 гадоў з дня нараджэння А. У. Сінкаўца (1973)*

**Сінкавец Аляксандр Уладзіміравіч** - кандыдат біялагічных навук, дацэнт. Нарадзіўся Аляксандр Сінкавец 4 красавіка 1973 г. у в. Дзівін Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1990 г. закончыў Дзівінскую сярэднюю школу з залатым медалём. Паступіў у Віцебскі ветэрынарны інстытут, у 1995 г. закончыў Віцебскую дзяржаўную акадэмію ветэрынарнай медыцыны (ВДАВМ) па спецыяльнасці «Ветэрынарыя». Апублікавана 22 навуковыя працы, у тым ліку 7 вучэбна-метадычных.

**Гапанович, А. Н.** Александр Владимирович Синковец / Афанасий Гапанович // Дивин - древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 77. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Сінкавец Аляксандр Уладзіміравіч** // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 51-52.

**Сінкавец Аляксандр Уладзіміравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 127-128.

### *95 гадоў з дня нараджэння Г. А. Сташэўскай (1928)*

**Сташэўская Ганна Антонаўна** нарадзілася ў 1928 г. у в. Конань Рэчыцкага раёна. У 1961-1972 гг. - выхавацель Гарадзецкай школы-інтэрната, выхавацель групы прадоўжанага дня Гарадзецкай СШ (1972-1983). Званне «Заслужаны настаўнік Беларускай ССР» прысвоена ў 1965 г.

**Сташэўская Ганна Антонаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 430-431. – (Вызначыліся працай).

**Сташэўская Ганна Антонаўна** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 113. : фат.

### *105 гадоў з дня нараджэння А. В. Сунцава (1918)*

**Сунцаў Андрэй Васільевіч** (1918–1983). Нарадзіўся 15 кастрычніка 1918 г. у в. Стары Цяжынскага раёна Кемераўскай вобласці. Прымаў удзел у абароне Сталінграда. Закончыў вайну ў маі 1945 г. у званні капітана. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені. З 1948 г. жыў у Кобрыне, працаваў у розных арганізацыях горада.

**Сунцаў Андрэй Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 245 - (Крутымі дарогамі вайны).

### *45 гадоў з дня нараджэння Р. М. Супруновіч (1978)*

**Супруновіч Рыта Міхайлаўна** – беларускі вучоны-эканаміст, нацыянальны эксперт, кансультант, перакладчык. Нарадзілася ў 1978 г. у г. Кобрыне Брэсцкай вобласці. Аўтар звыш 30 навуковых прац, у тым ліку 3 манаграфій. Сфера навуковых інтарэсаў: рэгуляванне міжнароднай працоўнай міграцыі, міжнародны рынак працы, міжнародныя эканамічныя адносіны ў сферы рынку працы, працоўнай міграцыі.

**Супрунович Рита Михайловна** : об авторе // Беларуская думка. – 2013. - № 9. – С. 77-83.

**Супрунович Маргарита Михайловна** [Электронный ресурс] // Экономика by. – Режим доступа: http://ekonomika. by/ekonomisty/ suprunovich-margarita-mikhajlovna. – Дата доступа: 22.03.2017.

### *125 гадоў з дня нараджэння Д. Н. Фалькоўскага (1898)*

**Фалькоўскі (сапраўднае – Ляўчук) Дзмітрый Нікіфаравіч** (1898-1934) - паэт. Нарадзіўся 3 лістапада 1898 г. у в. Вялікія Лепясы. Лепшае, што ён стварыў - тонкія лірычныя творы, многія з якіх прысвечаны родным мясцінам. 17 снежня 1934 г. паэта не стала. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1957 г. У Лепясах ёсць вуліца Фалькоўскага, а на месцы, дзе некалі стаяла яго родная хата, – мемарыяльны знак.

**Дзмітрый Фалькоўскі** // Літаратурная карта Берасцейшчыны. - Брэст, 2008. – С. 314-315.

**Дмитрий Фальковский** (1898-1934) // До тебе, світе... українська література Берестейщини. Киів, 2003. - С. 188-208.

**Ляшук, В. Я.** Фалькоўскі Д. / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко // Літаратурная Берасцейшчына: краязн. нарысы, партрэты, арт. / В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. - Мінск, 2008. - С. 210-211.

**Фальковский Дмитрий Никифорович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. – В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2-х кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 430.

**Фалькоўскі** (сапраўднае прозвішча – Ляўчук) **Дзмітрый Нікіфаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 442-443. - (Імі ганарацца землякі ).

**Фалькоўскі Дзмітрый** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск., 2003. - Т. 16. - С. 311.

**Другак, Ю.** Воспоминания о поэте / Юрий Другак // Кобрынскі веснік. - 2018. — 31 кастрычніка. — С. 5. - К 120-летию со дня рождения уроженца д. Большие Лепесы поэта Дмитрия Фальковского.

### *75 гадоў з дня нараджэння Р. М. Філімоненкавай (1948)*

**Філімоненкава (Кукіна) Раіса Мікалаеўна** – вучоны, кандыдат тэхнічных навук (1982) , дацэнт (1991). Нарадзілася 25 лютага 1948 г. у г. Дуброўна Віцебскай вобласці. Пражывала ў Кобрыне з 1960 г па 1968 г. Закончыла СШ № 2 г. Кобрына і паступіла ў Віцебскі тэхналагічны інстытут лёгкай прамысловасці. Р. М. Філімоненкава мае больш за 120 навуковых і звыш 50 метадычных публікацый, у тым ліку адзін падручнік і тры вучэбных дапаможніка з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

**Філімоненкава (Кукіна) Раіса Мікалаеўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 144-146.

### *105 гадоў з дня нараджэння А. М. Фіначкі (1918)*

**Фіначка Аляксандр Максімавіч** (1918–1987). Нарадзіўся ў 1918 г. у пас. Вялікае Фёдараўскага раёна Кустанайскай вобласці. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына, Брэста, Варшавы, штурме Берліна. Узнагароджаны медалямі. Пасля дэмабілізацыі ў 1950 г. жыў і працаваў у Кобрыне. Памёр 3 сакавіка 1987 г.

**Фіначка Аляксандр Максімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 246. - (Крутымі дарогамі вайны).

### *75 гадоў з дня нараджэння М. Н. Хабібуліна (1948)*

**Хабібулін Мансур Набіулавіч** - маёр. Нарадзіўся 2 жніўня 1948 г. у г. Новасібірску (Расія). Служыў у Беларускай ваеннай акрузе. Прымаў удзел у ліквідацыі вынікаў аварыі на Чарнобыльскай АЭС, за што ўзнагароджаны ордэнам «За службу Радзіме ва Узброеных СССР» III ступені. З 1987 г. - у Афганістане. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Пахаваны на могілках в. Пецькі.

**Хабібулін Мансур Набіулавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 447. - (Загінулі ў Афганістане).

### *100 гадоў з дня нараджэння В. А. Хоміча (1923)*

**Хоміч Васіль Андрэевіч** нарадзіўся 13 кастрычніка 1923 г. у в. Сычова Жабінкаўскага раёна. З 1940 г. да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у будаўніцтве абарончых збудаванняў пад Брэстам. Ваяваў у партызанскім атрадзе імя Фрунзе брыгады імя Сталіна ў складзе разведвальна-дыверсійнай групы. Узнагароджаны двума ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, медалямі. Пасля вызвалення Брэстчыны ад фашысцкіх захопнікаў служыў у органах НКУС Кобрына, з 1951 г. працаваў інспектарам сыравіннага аддзела Кобрынскага кансервавага завода, з 1967 г. - майстрам у «Міжкалгасбудзе».

**Хоміч Васіль Андрэевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 226-227. - (Змагаліся ў тыле ворага).

### *100 гадоў з дня нараджэння С. М. Шабашова (1923)*

**Шабашоў Сяргей Міхайлавіч** (1923–2007). Нарадзіўся 1 мая 1923 г. у в. Драгуны Лёзненскага раёна. Закончыў Магілёўскі педінстытут (1956), ВПШ пры ЦК КПСС (1961). У 1961-1962 гг. першы сакратар Кобрынскага райкама КПБ. З 1962 года – начальнік Кобрынскага калгасна-саўгаснага ўпраўлення Брэсцкай вобласці. За баявыя і працоўныя заслугі перад Радзімай узнагароджаны ордэнамі Леніна, Кастрычніцкай рэвалюцыі, Айчыннай вайны І і ІІ ступеней, ордэнам «Знак Пашаны», Працоўнага Чырвонага Сцяга (тройчы), шматлікімі медалямі. Быў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР трох скліканняў. Ганаровы грамадзянін горада Віцебска.

**Шабашоў Сяргей Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 456. - (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Шабашоў Сяргей Міхайлавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 27. : фат.

### *65 гадоў з дня нараджэння У. В. Шапецюка (1958)*

**Шапяцюк Уладзімір Васільевіч,** лейтэнант. Нарадзіўся 26 жніўня 1958 г. у в. Лелікава Кобрынскага раёна. Служыў у Афганістане. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі (пасмяротна), медалём. Пахаваны на могілках в. Лелікава.

**Шапяцюк Уладзімір Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 447-448 - (Загінулі ў Афганістане).

**Шапяцюк Уладзімір Васільевіч** // Памяць. Афганістан. - Мінск, 1991. - С. 470-471.

**Суворов, А. М.** Воины-интернационалисты Кобринского района / А. М. Суворов // На линии огня воины-интернационалисты Брестской области в Афганской войне / А. М. Суворов. -Брест, 2010. - С. 174-177, 210, 244-247.

### *90 гадоў з дня нараджэння Г. Р. Шаўчук (1933)*

**Шаўчук Ганна Рыгораўна** нарадзілася ў 1933 г. у в. Нятрэба. Заслужаны работнік аховы здароўя (1982). Працавала в.а. галоўнага ўрача Гарадзецкай урачэбнай амбулаторыі.

**Шаўчук Ганна Рыгораўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Шаўчук Ганна Рыгораўна** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 118. : фат.

### *75-гадоў з дня нараджэння В. Ф. Швайко (1948)*

**Швайко Валянціна Фёдараўна** - вучоны, кандыдат філасофскіх навук, дацэнт Нацыянальнага інстытута адукацыі, загадчык кафедры методыкі выхавання Рэспубліканскага інстытута павышэння кваліфікацыі. Нарадзілася ў 1948 г. у в. Астромічы.

**Швайко Валянціна Фёдараўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 444. – (Імі ганарацца землякі).

**Швайко Валянціна Фёдараўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 152-153.

### *115 гадоў з дня нараджэння М. Ц. Шыша (1908)*

**Шыш Мікалай Цімафеевіч** нарадзіўся ў 1908 г. у в. Худлін. У гады Вялікай Айчыннай вайны камандзір партызанскага атрада, які дзейнічаў у зоне Дняпроўска-Бугскага канала. У 1942 г. М. Ц. Шыш загінуў у адным з баёў. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, яго імем названы створаны ім атрад у брыгадзе імя Молатава, вуліцы ў г. п. Антопаль, на радзіме ў в. Худлін пастаўлены помнік.

**Шыш Мікалай Цімафаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 218 - (Змагаліся ў тыле ворага).

### *100 гадоў з дня нараджэння А. Д. Шышко (1923)*

**Шышко Андрэй Давыдавіч** нарадзіўся ў 1923 г. у в. Турная. У гады Вялікай Айчыннай вайны сувязны партызанскіх груп, партызан атрада імя Суворава брыгады імя Молатава Пінскага партызанскага злучэння. Удзельнічаў ў вызваленні Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў. Удзельнічаў у вайне з Японіяй. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Шышко Андрэй Давыдавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 227. - (Змагаліся ў тыле ворага).

### *125 гадоў з дня нараджэння В. П. Энгельгарта (1898)*

**Энгельгарт Васілій Паўлавіч** (1828–1915) - астраном і мецэнат, член-карэспандэнт Пецярбургскай АН (1890), доктар астраноміі. Нарадзіўся 17(29) ліпеня 1828 г. у в. Кустовічы Гродзенскай губерні. Паходзіў са знакамітага шляхецкага роду Энгельгардтаў. Закончыў Пецярбургскае вучылішча правазнаўства. У снежні 1889 г. В. П. Энгельгарт быў удастоены звання «Ганаровы доктар Казанскага ўніверсітэта». 1 снежня 1890 г. Васілій Паўлавіч выбраны членам-карэспандэнтам Пецярбургскай акадэміі навук па разраду матэматычных навук фізіка-матэматычнага аддзялення.

**Гапоненка, В. А**. Энгельгарт Васіль Паўлавіч / В. А. Гапоненка // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2004. – Т. 18, кн. 1. – С. 123.

**Энгельгарт Васіль Паўлавіч** // 250 асоб з Беларусі у дыялогах культур : даведачнае выданне. – Мінск, 2008. – С. 105,106.

**Энгельгарт Васілій Паўлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 154-156.

### *500 гадоў з дня нараджэння Г. Ягелонкі (1523)*

**Ганна Ягелонка** (18.10.1523, Кракаў – 09.09.1596) - польская каралева, дачка Жыгімонта І Старога і Боны Сфорцы. Актыўна ўдзельнічала ў гаспадарчых справах дзяржавы, надаванні права самакіравання каралеўскім гарадам (сярод іх і Кобрын), трымала ў Варшаве ўласны двор.

**Ганна Ягелонка** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 47.

### *75 гадоў з дня нараджэння Л. В. Яроміна (1948)*

**Яромін Лявонцій Васільевіч** нарадзіўся ў 1948 г. у в. Папялёва Пружанскага раёна. Заслужаны работнік сацыяльнай абароны (1998). Працаваў фельчарам Тэльменскай амбулаторыі, дырэктарам Шарашоўскага дома інвалідаў, Шарашоўскага псіханеўралагічнага інтэрната, з 1983 г. - дырэктар Кобрынскага псіханеўралагічнага інтэрната. За добрасумленныя адносіны да працы, высокія вынікі і вялікі асабісты ўклад у развіццё галіны ў 1998 г. Л. В. Яроміну было прысвоена званне «Заслужаны работнік сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь». Па выніках працы ў 2007 г. атрымаў ганаровае званне «Чалавек года».

**Яромін Лявонцій Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 429. – (Вызначыліся працай).

**Яромін Лявонцій Васільевіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 127-128. : фат.

# Юбілейныя даты рэлігійных устаноў

### *Свята-Аляксандра-Неўскаму сабору ў г. Кобрыне (1868) – 155 гадоў*

**Сабор Аляксандра Неўскага** - галоўная праваслаўная святыня Кобрына. Пабудаваны ў 1864-1868 гг. з цэглы ў гонар адмены прыгоннага права, побач з брацкай магілай рускіх воінаў, што загінулі ў вайну 1812 у час Кобрынскага бою 15 ліпеня 1812 г. У 1960 г. Аляксандра-Неўскі сабор быў зняты з уліку і пераабсталяваны ў планетарый, потым архіў. 12 верасня 1990 г. у дзень памяці Аляксандра Неўскага сабор быў нанава ў другі раз асвячоны Высокапраасвяшчэннейшым Філарэтам, Патрыяршым Экзархам усяе Беларусі. Пачалося яго адраджэнне. Храм унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Кобринский** собор Александра Невского // Регионы Беларуси : энциклопедия. - В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. – Минск, 2009. – Кн. 1. – С. 480.

**Кобринский** Свято-Александро-Невский собор // Туристические регионы Беларуси. – Минск, 2008. – С. 73.

**Кобрынскі** Сабор Аляксандра Неўскага // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 4. – С. 519-520.

**Кулагін, А. М.** Свята-Александра-Неўскі Сабор / А. М. Кулагін // Праваслаўныя храмы Беларусі / А. М. Кулагін. – Мінск, 2001. – С. 101-102.

**Петросова, Е. Ю.** Собор Александра Невского / Е. Ю. Петросова // Свод памятников истории и культуры Белорусии. Брестская область. – Минск, 1990. – С. 250, 251.

**Пятросава, А. Ю.** Кобрынскі сабор Аляксандра Неўскага / А. Ю. Пятросава // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. - С. 371.

### *Царкве Святога нараджэння Хрыстова (2008) – 15 гадоў*

**Храм Святога нараджэння Хрыстова** размешчаны ў новым мікрараёне г. Кобрына. У дзень 60-годдзя вызвалення Кобрына ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (18 ліпеня 2004 г.) быў закладзены першы камень пад будучы храм. 3 лютага 2008 года адбылося асвячэнне ніжняга храма царквы Раства Хрыстова ў гонар прападобнага Сергія Раданежскага. 23 лістапада 2017 г. адбылася значная падзея – заканчэнне будаўніцтва храма і ўрачыстае асвячэнне верхняга храма царквы Святога нараджэння Хрыстова.

**Бялоў, Д.** У Божую славу, на радасць людзям / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. – 29 лістапада. – С. 1.

### *Свята-Ільінскай царкве ў в. Бяроза (1863) - 160 гадоў*

**Свята-Ільінская царква** знахозіцца на могілках у в. Бяроза. Пабудавана ў 1863 г. з дрэва. Помнік народнага дойлідства. Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Свята-Ільінская** царква // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 46. : каляр. фота.

### *Свята-Мікалаеўскай царкве ў в. Верхалессе (1888) - 135 гадоў*

**Свята-Мікалаеўская царква** пабудавана ў 1888 г. у в. Верхалессе**.** Мае рысы стылю класіцызму. Архітэктар Ф. Залатароў. Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Свята-Мікалаеўская** царква ў в. Верхалессе // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 466. – (Драўлянае царкоўнае дойлідства).

# Юбілейныя даты прадпрыемстваў і устаноў горада і раёна

### *Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Кобрынскі кансервавы завод» (1948) - 75 гадоў*

Прадпрыемства з трывалымі традыцыямі. Заснавана ў 1948 г. Гэта адно з найстарэйшых харчовых прадпрыемстваў рэспублікі. У завадскіх цэхах выраблялася больш 150 найменняў агароднінных, таматавых і фруктовых кансерваў. У 1997 г. дзяржаўнае прадпрыемства «Кобрынскі кансервавы завод» набыло статус акцыянернага таварыства адкрытага тыпу. Прадукцыя завода адзначана шматлікімі дыпламамі, узнагародамі і граматамі. Візітнай карткай завода з'яўляліся такія кансервы, як «Гарошак зялёны» і «Ікра кабачковая», якія карыстаюцца нязменна высокім попытам у пакупнікоў. Прадстаўлены ў шырокім асартыменце групы абедзенных і закусачных кансерваў. У сярэдзіне 2000-х гг. прадпрыемства рэзка скараціла выпуск прадукцыі, потым зусім зачынілася і было выстаўлена на продаж. Шмат разоў праводзіліся аўкцыёны, але вынікаў не было. 2016 г. стаў прарыўным для былога кансервавага завода. Уласнікам усяго комплексу будынкаў стала ЧУП «Жылбудкамплект» - мясцовае прадпрыемства, якое на працягу дзясятка гадоў займаецца будаўніцтвам. На месцы кансервавага завода новы

ўласнік плануе выкарыстоўваць яго памяшканні для гадоўлі рыбы. Зрэшты, і ранейшы брэнд - кансервавую вытворчасць - новы ўласнік плануе захаваць.

**Адкрытае** акцыянернае таварыства «Кобрынскі кансервавы завод» // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка - Мінск, 2002. – С. 412. – (З гісторыі прадпрыемстваў Кобрына).

**Кобрынскі** кансервавы завод // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 8. – С. 370.

**Кобринский к**онсервный завод. - Минск, 1988. – 24 с.

### *Сумеснаму таварыству з абмежаванай адказнасцю «Вытворчае прадпрыемства Палессе» (1998) - 25 гадоў*

Гісторыя **СТАА «ВП Палессе»** распачыналася ў студзені 1998 г. За гады існаванні прадпрыемства вырасла ў чатыры цэхі: інструментальны, ліцейны, зборачны, канструктарскае бюро. Асвоены поўны цыкл вытворчасці дзіцячай цацкі - ад стварэння канструктарскай дакументацыі да атрымання канчатковага прадукта. Непаўторныя колеры, дызайн, якасць, нізкія кошты, гнуткая сістэма збыту, дастаўка аптовых партый тавара буйным спажыўцам транспартам прадпрыемства робяць цацку прывабным таварам. Якасць прадукцыі пацверджана сертыфікатамі якасці. На сучасным этапе свайго развіцця СТАА «ВП Палессе» – буйнейшы вытворца дзіцячай цацкі з пластмасы ў Беларусі, займае адну з лідзіруючых пазіцый у рэйтынгу сярод вядучых еўрапейскіх прадпрыемстваў. Прадпрыемства аказвае вялікую спонсарскую дапамогу, нямала робіць для роднага горада. Сапраўднай «фішкай» для кабрынчан і гасцей горада стала адкрыццё новага трохпавярховага гандлёвага цэнтра «Палессе», дзе можна набыць шырокі спектр тавараў.

**Елизарова, Ж.** Здесь исполняются детские мечты / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 22 ліпеня (№ 56). — С. 4 : фот. - Игрушки торговой марки «Полесье» — безопасный, интересный и долговечный продукт для детей разных возрастов.

**Белов, Д**. СООО «ПП Полесье»: гордость кобринчан / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2018. — 14 ліпеня. — С. 3. - СООО «ПП Полесье» — один из лучших в Европе производственных комплексов.

### *Унітарнаму прадпрыемству «Кобрынскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм» (1953) - 70 гадоў*

УП «Кобрынскае прадпрыемства меліярацыйных систэм» (УП «Кобрынскае ПМС») - адно з найбуйнейшых меліярацыйных прадпрыемстваў Брэстчыны з багатай гісторыяй. У сакавіку 1953 г. намеснікам міністра меліярацыі Беларускай ССР М. Сідоркіным быў падпісаны загад № 112 аб арганізацыі ў Кобрыне Мухавецкага ўпраўлення тэхнічнай эксплуатацыі асушальных сістэм, пазней перайменаванае ў Мухавецкае ўпраўленне асушальных сістэм (УАС). Першым яго кіраўніком стаў Мікалай Паўлавіч Угляніца. УП «Кобрынскае ПМС» выконвае шырокі спектр работ у сферы меліярацыі. Асноўная задача прдпрыемства – стварэнне ўмоў для павышэння прадукцыйнасці працы ў сельскагаспадарчай вытворчасці і эфектыўнага выкарыстання меліяраваных зямель.

**Бялоў, Д.** З клопатам аб роднай зямлі : [аб рабоце УП «Кобрынскае прадпрыемства меліярацыйных сістэм»] / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2020. 6 чэрвеня (№ 43). - С. 1 : фат.

### *Закрытаму акцыянернаму таварыству «Аптымалсэрвіс» (1998) - 25 гадоў*

**ЗАТ «Аптымалсэрвіс»** зарэгістравана рашэннем Брэсцкага аблвыканкама ад 23 лютага 1998 г. № 445. Асноўнымі напрамкамі дзейнасці ЗАТ «Аптымалсэрвіс» з'яўляюцца праектаванне і будаўніцтва сістэм унутранага газазабеспячэння жылых, адміністр-

рацыйных будынкаў, вытворчасць вырабаў з ПВХ (вокны, дзверы). ЗАТ «Аптымалсэрвіс» мае ва ўласнасці адміністрацыйны будынак і вытворчае памяшканне плошчай каля 1000 кв. м. На прадпрыемстве працуе больш за 100 чалавек.

**ЗАО «Оптималсервис»** // Мы строим Брестчину. – Брест, 2019. – С. 301 : фот.
**Белов, Д.** 10 лет оптимальной работы / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2008. - 16 жніўня. - С. 3.

### *Замежнаму таварыству з абмежаванай адказнасцю «БЕЛКЕІЗІНГ» у г. Кобрыне (2008) – 15 гадоў*

**Замежнае таварыства з абмежаванай адказнасцю «БЕЛКЕІЗІНГ»** у г. Кобрыне ўтворана на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, зарэгістравана Брэсцкім абласным выканаўчым камітэтам галоўным упраўленнем юстыцыі загадам ад 16 чэрвеня 2008 г. № 28. Таварыства з'яўляецца камерцыйнай арганізацыяй з замежнымі інвестыцыямі. Гэта прадпрыемства па перапрацоўцы натуральнай абалонкі для каўбасных вырабаў. Прадукцыя мае высокія якасныя характарыстыкі, значная частка выробленай прадукцыі рэалізуецца праз рознічныя гандлёвыя сеткі, частка вырабаў - праз аптовы гандаль, у тым ліку і на экспарт. Натуральныя абалонкі, якія выпускаюцца ЗТАА «Белкеизинг», выкарыстоўваюць пры вытворчасці каўбас многія мясаперапрацоўчыя прадпрыемствы Польшчы, Германіі, Францыі, Італіі, Іспаніі.

**Ализар, К.** Качественная продукция, всеобщее призвание / Ксения Ализар // Кобрынскі веснік. - 2019. — 20 ліпеня. — С. 4 : фот.
**Лидер** колбасных оболочек // Кобрин-информ. - 2013. — 20 июня. — С. 5.

### *Прыватнаму ўнітарнаму вытворча-гандлёваму прадпрыемству «Шкloліт» (2003) – 20 гадоў*

Прадпрыемства **«Шкloліт»** працуе на рынку вытворчасці і мантажу аконных канструкцый з 2003 г. і з'яўляецца адным з актыўных удзельнікаў гэтага рынку ў Беларусі. «Шкloліт» - уласны вытворца, што з'яўляецца залогам і гарантыяй якасці вырабаў.

**«Стеклолит»** работает «под ключ» // Заря. - 2016. — 23 апреля. — С. 4. - Более 10 лет в Кобрине работает предприятие «Стеклолит» по производству и монтажу окон и дверей.
**Волков, С.** Уют вашему дому принесет кобринское частное предприятие «Стеклолит» / Сергей Волков // Заря. - 2015. — 24 января. — С. 12. - На предприятии «Стеклолит» точно знают, как изготовить окна и двери для любого жилища.

### *Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Грушаўскі рамонтна-механічны завод» (1963) - 60 гадоў*

Прадпрыемства пачало сваю дзейнасць у 1963 г. як рамонтна-экскаватарныя майстэрні. У 1980 г. прадпрыемства было перайменавана ў Грушаўскі рамонтна-механічны завод, са студзеня 2001 г. - ААТ «Грушаўскі рамонтна-механічны завод». Асноўныя віды прадукцыі прадпрыемства: вытворчасць меліярацыйнага абсталявання, рамонт абсталявання помпавых станцый, вытворчасць запчастак да экскаватараў, вытворчасць будаўнічых металаканструкцый, апрацоўка драўніны, вытворчасць сталярных вырабаў.

**Муха, Ф**. В поиске идей / Федор Муха ; фото Валеря Короля // Заря. - 2019. — 18 декабря (№ 100). — С. 17 : фот. - История и сегодняшний день ОАО «Грушевский РМЗ».
**Руками** грушевских мастеров // Кобрынскі веснік. - 2017. - 21 студзеня. - С. 1. - На ОАО «Грушевский ремонтный завод» осваивают выпуск новых видов продукции.
**Семенов, С**. Завод, не теряющий актуальности / Сергей Семёнов // Брестский калейдоскоп. – 2017. - № 15 (август). – С. 1.

### *Установе «Занальны дзяржаўны архіў у г. Кобрыне» (1963) – 60 гадоў*

11 лістапада 1963 г. у Кобрыне быў створаны **філіял Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці ў г. Кобрыне.** Улістападзе 1996 г. філіял перайменаваны ў «Занальны дзяржаўны архіў г. Кобрына». З 22 мая 2001 г. архіў стаў называцца па-новаму –«Навукова-метадычная ўстанова «Занальны дзяржаўны архіў у г. Кобрыне». Кобрынскі архіў – вялікі трохэтажны будынак, у якім захоўваецца архіўная інфармацыя, пачынаючы з 1944 г., не толькі з Кобрынскага раёна, а таксама з Бярозаўскага, Пружанскага, былых Дзівінскага, Шэрашэўскага, Ружанскага раёнаў і горада Белаазёрска. У архіве функцыянуюць два аддзелы: аддзел забеспячэння захоўвання, выкарыстання і публікацый дакументаў і аддзел камплектавання, ведамасных архіваў і справаводства.

**Заруба, С.** Архивному делу Брестчины – 75 лет / Светлана Заруба // Кобрынскі веснік. – 2015. – 11 лютага. – С. 5. - Из истории Кобринского зонального государственного архива.

**Об утверждении** системы государственных архивных учреждений Республики Беларусь : постановление Совета Министров Республики Беларусь, 20 марта 2012 г., № 243 // Национальный реестр правовых актов Республики Беларусь. - 2012. - № 36. - С. 24-25. - Упоминается учреждение «Зональный государственный архив в г. Кобрине».

**Бакун, Е.** История живет в архивах... / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2020. — 3 кастрычніка (№ 77). — С. 4 : фот. - О работе учреждения «Зональный архив г. Кобрина»

**Свитич, Д.** Сохраняя историю, творим будущее / Диана Свитич ; фото Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 8 лютага (№ 10). — С. 1, 3 : фот. - Об истории образования архивной службы Брестской области и работе учреждения «Зональный государственный архив в г. Кобрине».

# Юбілейныя даты медыцынскіх устаноў

### *Дзяржаўнай установе «Кобрынскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў» (1968) – 55 гадоў*

Установа была зарэгістравана як **псіханеўралагічны дом-інтэрнат** ад 10 красавіка 1968 г., з верасня 1969 г. у ім з'явіліся першыя пражываючыя. Першым дырэктарам дома-інтэрната быў Л. В. Храловіч, з 1983 г. установу ўзначальваў Л. В. Яромін. У 1981 г. дом-інтэрнат атрымаў псіханеўралагічны профіль. Дом-інтэрнат уключае ў сябе два асобна размешчаных будынка: па вул. Паўночная, 142 і па вул. Савецкая, 134 у г. Кобрыне. Дзейнасць дома-інтэрната накіравана на стварэнне спрыяльных умоў для пражывання грамадзян, ажыццяўленне медыка-сацыяльнай, працоўнай рэабілітацыі і бяспечнага пражывання грамадзян. У доме-інтэрнаце распрацавана праграма рэабілітацыі. Узровень работы ўстановы «Кобрынскі псіханеўралагічны дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў» з'яўляецца прыкладам для іншых падобных устаноў. Калектыў дома-інтэрната неаднойчы займаў першае месца ў вобласці і не раз станавіўся лепшым у рэспубліканскіх спаборніцтвах.

**Данилюк, Н. «**В нашем доме должно быть уютно» / Николай Данилюк ; [беседовала] Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2017. - 26 января. - С. 3. - Беседа с директором Кобринского психоневрологического дома-интерната Н. Данилюком.

# Юбілейныя даты ўстаноў адукацыі

### *Установе адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж» (1968) - 55 гадоў*

**Кобрынскае прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 102 будаўнікоў** заснавана ў 1968 г. на базе трэста «Брэстсельбуд». У розны час мела назвы: гарадское прафесійна-тэхнічнае вучылішча, сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча, прафесійна-тэхнічнае вучылішча. 29 ліпеня 1997 г. вучылішча перайменавана ў вышэйшае прафесійна-тэхнічнае вучылішча будаўнікоў. У 2003 г. перайменавана ва УА «Кобрынскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж будаўнікоў». На падставе рашэння Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта ад 19 жніўня 2013 г. № 577 зменены выгляд і назва ўстановы адукацыі «Кобрынскі дзяржаўны прафесійна-тэхнічны каледж будаўнікоў» на «Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж». З 1 сакавіка 2014 г. на падставе рашэння Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта № 827 ад 27 лістапада 2014 г. да каледжу ў якасці аддзялення мастацкіх рамёстваў і дрэваапрацоўкі далучана УА «Кобрынскі дзяржаўны мастацкі прафесійна-тэхнічны каледж».

**Кобрынскае** вышэйшае прафесійнае вучылішча будаўнікоў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 413.

**Церахава, Н.** Адпавядаць патрабаванням сусветных стандартаў / Надзея Церахава // Настаўніцкая газета. - 2019. — 25 чэрвеня. — С. 8. - У Кобрынскім дзяржаўным політэхнічным каледжы ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

**Елизарова, Ж.** Профтех — всему начало / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2019. — 4 снежня (№ 94). — С. 4 : фот. - Кобринский политехнический колледж дает отличные возможности для профессионального становления молодежи.

**Грышкевіч, С.** Удасканальваць падрыхтоўку кадраў ва ўмовах інавацыйнага развіцця рэгіена / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2017. - 12 верасня. – С. 5. - Кобрынскі дзяржаўны політэхнічны каледж не толькі рыхтуе рабочых і спецыялістаў, але і ажыццяўляе перападрыхтоўку рабочых кадраў.

**Колледжу** строителей – 35 лет // Кобрин-информ. - 2003. - 23 октября. – С. 2.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Гімназія г. Кобрына» (1963) – 60 гадоў*

**Школа № 5 г. Кобрына** адчыніла свае дзверы ў 1963 г. Рашэннем Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта Брэсцкай вобласці ад 27 верасня 2005 № 544 СШ № 5 г. Кобрына была рэарганізавана ў гімназію.

**Казакова, А.** Территория знаний и опыта / Анна Казакова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 17 лютага. — С. 9. - В рейтинге лучших учреждений образования г. Кобрина первую позицию занимает гимназия.

**Грицук, А**. Не только гранит науки / Анастасия Грицук // Кобрынскі веснік. - 2017. - 2 жніўня. - С. 4. - Жизнь учащихся гимназии № 5 г. Кобрина насыщена и разнообразна.

**Гімназія** г. Кобрына : творчы праект «Энцыклапедыя «Школы Беларусі» ; каардынатар творчага праекта С. У. Мазурына // Народная асвета. - 2016. - № 12. - С. 50-80. – (Выпуск «Энцыклапедыя «Школы Беларусі»).

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Сярэдняя школа № 6 г. Кобрына» (1973) - 50 гадоў*

19 чэрвеня 1973 года Кобрынскім гарадскім Саветам дэпутатаў працоўных прынята рашэнне аб адкрыцці **сярэдняй школы № 6 горада Кобрына**. 1 верасня 1973 г. адбылося ўрачыстае адкрыццё сярэдняй школы № 6.

**Грышкевіч, С**. Пашырылі веды пра родны край / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2016. - 16 ліпеня. - С. 6. - Каманда вучняў СШ № 6 прыняла ўдзел у краязнаўчай алімпіядзе ў дыстанцыйным фармаце.

**Премия** спецфонда // Кобрин-информ. - 2015.- 16 июля. - С. 3. - Премией спецфонда Президента Республики Беларусь по социальной поддержке одаренной молодежи поощрен Гангало Владимир, ученик СШ № 6.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Сярэдняя школа № 8 г. Кобрына» (1988) - 35 гадоў*

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Сярэдняя школа № 8 г. Кобрына»** функцыянуе з 1 верасня 1988 г. У 1993 г. школа афіцыйна атрымала статус «Установа адукацыі з паглыбленым вывучэннем англійскай мовы», у 1996 г. упершыню на Кобрыншчыне былі адкрыты ліцэйскія класы ад Беларускай політэхнічнай акадэміі (цяпер БНТУ).

**Бакун, А.** Нам засталася спадчына / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 13 мая. – С. 4. – Вучні СШ № 8 прынялі ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Чытаем разам Купалу і Коласа».

**С днём** рождения, школа! // Кобрин-информ. - 2008. - 27 ноября. - С. 3. - СШ № 8 отметит своё 20-летие.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Сярэдняя школа № 9 г. Кобрына» (1993) - 30 гадоў*

**Школа № 9** заснавана ў 1993 г. У 1995 г. яна была рэарганізавана ў базавую школу. Памятным для школы стаў 2001 г., калі перад навучэнцамі і педагагічным калектывам расхінула дзверы новы будынак сярэдняй агульнаадукацыйнай школы.

**Елизарова, Ж.** Территория инноваций / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 18 ліпеня (№ 55). — С. 10 : фот. - ГУО «Средняя школа № 9» — одна из самых молодых в г. Кобрине.

**Елизарова, Ж.** Школа, которой всего 25! / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2018. — 1 снежня. — С. 3. - Средняя школа № 9 г. Кобрина отметила свое 25-летие.

**Гапанюк, М.** Вот и настал тот день / Маргарита Гапанюк // Кобрин-информ. - 2017. - 7 сентября. - С. 3. - Администрация и педагоги средней школы № 9 стараются создать комфортные условия для всех учащихся.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Арэхаўская сярэдняя школа» (1983) - 40 гадоў*

Школа адкрыта 13 верасня 1983 г. на тэрыторыі саўгаса «Днепра-Бугскі». У 1985 г. школа рэарганізуецца ў сярэднюю агульнаадукацыйную; з 2011 г. афіцыйная назва - дзяржаўная ўстанова адукацыі «Арэхаўская сярэдняя школа».

**Пальто, К.** Летний трудовой десант / Ксения Пальто // Кобрынскі веснік. - 2018. — 25 жніўня. — С. 9. - Студотряд учащихся Ореховской СШ занимался благоустройством своего агрогородка.

**Баланович, В.** Здесь помнят и любят каждого ученика// Кобрынскі веснік. - 2008. - 20 верасня. - С. 3.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Верхалеская сярэдняя школа» (1878) – 145 гадоў*

Першы школьны будынак у в. Верхалессе пабудаваны ў 1878 г. У 1953-1954 навучальным годзе ўступіў у строй новы будынак школы. Сучасны будынак школы адчыніў свае дзверы ў 1965 г. 3 верасня 2013 г. адкрыта група ясляў-сада.

**Пашкович, Л.** «Чистый водоем» в Верхолесье / Людмила Пашкович // Кобрынскі веснік. - 2016. - 30 красавіка. - С. 3. - Прошла ежегодная акция по благоустройству территории, прилегающей к водоему д. Верхолесье.

### ***Дзяржаўнай установе адукацыі «Навасёлкаўская сярэдняя школа Кобрынскага раёна» (1968) – 55 гадоў***

У 1968 г. у в. Навасёлкі пабудавана і пачала працаваць сучасная школа.

**Пашковіч, Л.** Калі паклікала родная школа ... / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2018. — 24 кастрычніка. — С. 4. - Навасёлкаўская сярэдняя школа адзначыла юбілей.

### ***Дзяржаўнай установе адукацыі «Пескаўская сярэдняя школа Кобрынскага раёна» (1983) – 40 гадоў***

31 жніўня 1983 г. у Кобрынскім раёне па адрасу в. Пескі 2, вул. Школьная, д. 9 была ўрачыста адкрыта новая школа. Яна была адкрыта як сярэдняя агульнаадукацыйная школа.

**Бялоў, Д**. І рэхам у сэрцы адгукнецца ... / Алена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2018. — 7 сакавіка. — С. 6. - У Пескаўскай сярэдняй школе прайшлі мерапрыемствы, прымеркаваныя да Дня роднай мовы.

**Достойный** проект // Кобрынскі веснік. - 2017. - 14 чэрвеня. - С. 4. - Учащиеся Песковской школы Н. Расторгуев и М. Кацевич стали призерами республиканского конкурса школьных проектов по энергоэффективности.

### ***Дзяржаўнай установе адукацыі «Акцябрская сярэдняя школа» (1913) - 110 гадоў***

Свой летапіс **Акцябрская школа** пачынае з 1913 г. У 1948 г. пабудавалі новы будынак пачатковай школы. З 1951 г. па 1962 г. працавала сямігадовая школа. З 1962 г. школа стала васьмігадовай. З 1990 г. Акцябрская васьмігадовая школа рэарганізавана ў сярэднюю агульнаадукацыйную. У 2008 г. – гэта вучэбна-педагагічны комплекс «Акцябрскі дзіцячы сад-сярэдняя школа».

**Дубіна, Л**. А школа... зялёная! / Людміла Дубіна // Кобрынскі веснік. - 2015. - 19 снежня. - С. 4. - Як вядзецца экалагічнае выхаванне дзяцей у Акцябрскім дзіцячым садзе.

### ***Дзяржаўнай установе адукацыі «Дзіцячы сад № 4 г. Кобрына» (1963) – 60 гадоў***

Установа адкрыта ў 1963 г. (новы будынак - у 1990 г.).

**Грышкевіч, С**. Пра дамашнюю божую кароўку, касметыку і не толькі / Сяргей Грышкевіч // Настаўніцкая газета. - 2019. — 13 красавіка. — С. 13. - Выхаванка яслі-сада № 4 г. Кобрына С. Левая атрымала дыплом І ступені абласнога этапу рэспубліканскага конкурсу даследчых работ дашкольнікаў.

### ***Дзяржаўнай установе адукацыі «Дзівінскі дзіцячы сад» (1973) – 50 гадоў***

Установа функцыянуе з 1973 г.

**Пашковіч, Л.** Гучыць у садку музыка... / Л. Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2012. - 3 сакавіка. - С. 10.

Музычныя заняткі ў Дзівінскіх яслях-саду.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Навасёлкаўскі дзіцячы сад Кобрынскага раёна» (1978) - 45 гадоў*

Установа адукацыі функцыянуе з 1978 г. З 1998 г. належыць аддзелу адукацыі, спорту і турызму Кобрынскага райвыканкама.

### *Дзяржаўнай установе адукацыі «Патрыкаўскі дзіцячы сад» (1978) – 45 гадоў*

**Патрыкаўскі дзіцячы сад** быў адкрыты ў 1978 г. У 1996 г рэарганізаваны ў Патрыкаўскую школу-сад. З 27 лістапада 2009 г. гэта - Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Патрыкаўскі дзіцячы сад-пачатковая школа». З 1 верасня 2013 г. - дзяржаўная ўстанова адукацыі «Патрыкаўскія яслі-сад».

**Сідрук, І.** У працэсе рамонту і з новымі цацкамі / Ігар Сідарук // Кобрынскі веснік. - 2013. — 26 кастрычніка. — С. 2. - Патрыкаўскі дзіцячы сад стаў больш светлым і прыгожым.

### *Дзяржаўнай установе спецыяльнай адукацыі «Спецыяльны дзіцячы сад № 1 г. Кобрына» (1953) – 70 гадоў*

5 верасня 1953 г. **Кобрынскі дзіцячы дом**, адзіны ў Брэсцкай вобласці, прыняў сваіх першых выхаванцаў. З таго часу дзіцячы дом стаў прыютам для многіх тысяч дзяцей дашкольнага ўзросту. З 8 жніўня 2019 г. на базе Кобрынскага дзіцячага дома пачаў фунцыянаваць «Спецыяльны дзіцячы сад № 1 г. Кобрына» для дзяцей, якія маюць патрэбу ў карэкцыі гаворкі.

**Ліпскі, У.** [Кобрынскі дзіцячы дом] / У. Ліпскі // Падкідыш: нарысы, публіцыстыка, дзённік. / У. Ліпскі. - Мінск, 1992. - С. 30.

**Савчук, М.** Кобринский детский дом реорганизован в специальный детский сад / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. - 2019. — 22 августа (№ 34). — С. 2 : фот. -

**Васюк, Н.** 55 - это отлично! / Наталья Васюк // Кобрин-информ. - 2008. - 11 сентября. – С. 18. - Кобринскому детскому дому – 55.

### *Дзяржаўнай установе спецыяльнай адукацыі «Кобрынскі цэнтр карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі» (1998) – 25 гадоў*

**Кобрынскі ЦКРНіР** забяспечвае стварэнне комплекснай сістэмы аказання псіхолага-медыка-педагагічнай дапамогі асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, атрыманне адукацыі асобамі з цяжкімі і (або) множнымі фізічнымі і (або) псіхічнымі парушэннямі. Цэнтр створаны на базе існаваўшага Цэнтра медыка-сацыяльнай рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў «Альфа» Беларускага таварыства інвалідаў на падставе Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11 лютага 1998 № 209 «Аб перадачы дзіцячых Цэнтраў медыка-сацыяльнай рэабілітацыі Беларускага таварыства інвалідаў», рашэння Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта ад 14 красавіка 1998 г. № 291, загаду ўпраўлення адукацыі аблвыканкама ад 30 кастрычніка 1997 г. № 216 і рашэнні Кобрынскага гарвыканкама ад 20 мая 1998 г. № 314 і з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, якая фінансуецца з мясцовага бюджэту.

**Ализар, К.** Вместе мы сильнее / Ксения Ализар // Кобрынскі веснік. - 2019. — 25 верасня. — С. 5 : фот. - О работе ГУО «Кобринский центр коррекционно-развивающего обучения и реабилитации».

**Бялоў, Д.** Дабрыня павінна быць дзейснай / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2017. - 27 верасня. - С. 3. - Кожны дзень выхаванцы Кобрынскага цэнтра карэкцыйна-развіваючага навучання і рэабілітацыі крок за крокам пераадольваюць цяжкасці і бар'еры.

# Юбілейныя даты ўстаноў культуры і ўстаноў адукацыі ў сферы культуры

### *Камунальнаму культурна-забаўляльнаму ўнітарнаму прадпрыемству «Парк імя А. В. Суворава» - 255 гадоў з часу закладкі (1768), 75 гадоў у статусе парку культуры і адпачынку (1948), 60 гадоў з часу прысваення статусу помніка садова-паркавага мастацтва (1963)*

**Парк імя А. В. Суворава** - парк культуры і адпачынку, помнік прыроды рэспубліканскага значэння. Названы ў гонар вялікага рускага палкаводца А. В. Суворава, якому належаў маёнтак «Кобрынскі ключ». Адносіцца да ліку найстарэйшых паркаў Беларусі. Утвораны ў 1768 г. па распараджэнні падскарбія Вялікага Княства Літоўскага А. Тызенгаўза. У 1795 г. за ратныя заслугі кобрынскі маёнтак разам з паркам быў падараваны Кацярынай II Сувораву. У 1808 г. маёнтак прададзена маёру Гельвігу, з сярэдзіны XIX ст. цэнтральная сядзіба прыналежыла Аляксандру Міцкевічу - брату польскага паэта Адама Міцкевіча. З 1948 г. з'яўляецца паркам культуры і адпачынку імя А. В. Суворава. Рашэннем дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па ахове прыроды ад 27 снежня 1963 г. кобрынскі парк зацверджаны помнікам прыроды і садова-паркавага мастацтва. У 1983 г. узнагароджаны дыпломам II ступені ВДНГ СССР. Пастановай Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь ад 16 ліпеня 2007 г. № 72 парк імя А. В. Суворава абвешчаны батанічным помнікам прыроды рэспубліканскага значэння. Сёння парк імя А. В. Суворава – гэта гаспадарча-разліковае прадпрыемства плошчай 32 га, змешчанае ў цэнтры горада. Праводзіцца работа па добраўпарадкаванні, культурна-масавая дзейнасць. У парку дзейнічаюць 18 атракцыёнаў, водныя ровары, танцпляцоўка, амфітэатр, ДРЦ «Кеша».

**Гарадскі** парк імя А. В. Суворава // Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінск,1984. - С. 220-221.

**Кобринский** парк имени А. В. Суворова // Туристские регионы Беларуси. - Минск, 2008. -С. 71.

**Кобринский** парк имени А. В. Суворова // Туристская энциклопедия Беларуси. - Минск, 2007. - С. 247.

**Кобрынскі** парк імя А. В. Суворава // Энцыклапедыя прыроды Беларусі : у 5 т. - Мінск, 1984. - Т. 3. - С. 50.

**Зялёная** жамчужына горада : інфармацыйна-пазнавальны даведнік з серыі «Ведай і любі свой горад» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : гал. бібліёграф С. Д. Курачук. – Кобрын, 2018. – 100 с. : іл.

### *Узорнаму ансамблю народнай песні і музыкі «Таўкачыкі» дзяржаўнай установы адукацыі «Дзіцячая школа мастацтваў г. Кобрына»(2003) – 20 гадоў*

**Узорны ансамбль народнай песні і музыкі «Таўкачыкі»** заснаваны ў 2003 г. Калектыў – лаўрэат і дыпламант фестываляў і конкурсаў, у тым ліку міжнародных. Ансамбль вядзе актыўную канцэртную дзейнасць

**Бялоў, Д.** Ад фестывалю - да фестывалю / Дзмітрый Бялоў // Кобрынскі веснік. - 2012.- 21 ліпеня.- С. 12. - Ансамбль «Таўкачыкі» школы мастацтваў прывёз цэлы набор дыпломаў з фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня».


2024

# Асноўныя юбілейныя даты горада і раёна

## *Кобрынскі раён у фактах і падзеях*

### *1519 год*

**Канец дынастыі князёў Кобрынскіх. Кобрын з прылеглымі землямі становіцца каралеўскім уладаннем – староствам (першы староста - Вацлаў Касцевіч). Гэтую дату можна ўмоўна лічыць пачаткам новага перыяду гісторыі горада.**

**Казлоў, Л. Р.** У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай / Л. Р. Казлоў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 31.

### *505 гадоў з часу стварэння Кобрынскай эканоміі, гаспадарчай адзінкі Вялікага Княства Літоўскага (1519)*

**Казлоў, Л. Р.** Кобрынская эканомія / Л. Р. Казлоў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 44-45.

### *1589 год, 5 студзеня*

**Кобрын атрымлівае Магдэбургскае права (самакіраванне).**

**Казлоў, Л. Р.** У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай / Л. Р. Казлоў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 34-37.

**Чирун, А.** Вольный город /Александр Чирун // Кобрынскі веснік. - 2009. – 19 жніўня. – С. 5.

**Мартынаў, А.** Унія на Кобрыншчыне / А. Мартынаў // Камуністычная праца. – 1990. - 6 студзеня.

### *1784 год*

**Апошні кароль Рэчы Паспалітай Станіслаў Аўгуст Панятоўскі наведвае Кобрын і Гарадзец пад час адкрыцця Каралеўскага канала. У гісторыі Кобрына гэта быў апошні візіт каранаванай асобы. Падыйшоў да канца і каралеўскі час горада.**

**Казлоў, Л. Р.** У складзе Вялікага княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай / Л. Р. Казлоў // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 37.

### *1939 год, 22 верасня*

**У Кобрын увайшлі савецкія войскі.**

**Пліско, Н. М.** Да новага жыцця / Н. М. Пліско // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 122-124.

**Той незабыўны верасень…** : З успамінаў А. М. Сушчука, ветэрана вайны і працы // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 124-124.

**Князева, В. М.** Сацыяльна-эканамічнае становішча Кобрыншчыны ў 1939-1940 гг. / В. М. Князева // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 126-130.

**Мартынов, А.** Судьбоносный 1939 / А. Мартынов // Кобрин-информ. – 2010. – 6 января. – С. 6.

### *1944 год, 20 ліпеня*

**20 ліпеня стаў памятным днём для жыхароў Кобрыншчыны. У гэты дзень войскамі 1-га Беларускага фронту ў ходзе Люблін-Брэсцкай аперацыі 1944 г. быў вызвалены Кобрын.**

**Пліско, Н. М.** Вызваленне / Н. М. Пліско // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 230-231. – 20 ліпеня 1944 г. стаў памятным для жыхароў Кобрыншчыны.

**Яны** вызвалялі Кобрыншчыну // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 232-239.

### *1944 год, 21 ліпеня*

**У ходзе Люблін-Брэсцкай аперацыі часцямі 212-й стралковай дывізіі (палкоўнік У. Г. Кучынёў) быў вызвалены Дзівін, цэнтр аднайменнага раёна, тэрыторыя якога ўваходзіць зараз у склад Кобрынскага раёна.**

### *1959 год, жнівень*

**У жніўні да Кобрынскага раёна далучаны Аніскавіцкі, Гарадзецкі і Грушаўскі сельсаветы скасаванага Антопальскага раёна, Верхалескі, Дзівінскі, Навасёлкаўскі, Павіццеўскі і Хабовіцкі сельсаветы скасаванага Дзівінскага раёна.**

# Юбілейныя даты населеных пунктаў Кобрынскага раёна

### *Акцябр– 500 гадоў з часу першага ўпамінання (1524)*

**Акцябр** (да 1940 г. Камень Шляхецкі; мясцовая назва Камэнь Шляхэцькый) - вёска ў Гарадзецкім сельсавеце.

**Акцябр** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1996. - Т. 1. - С. 223.

**Акцябр** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2.Брэсцкая вобласць. - С. 116-117.

**Акцябр** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 562.

### *Басяч – 435 гадоў з часу першага ўпамінання (1589)*

**Басяч** (мясцовая назва Босяч) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. Упамінаецца ў 1589 годзе.

**Басяч** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 123.

**Басяч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С 567.

### *Брылева – 475 гадоў з часу першага ўпамінання (1549)*

**Брылёва** - вёска ў Кіселявецкім сельсавеце. Упамінаецца ў 1549 г. у інвентары Кобрынскага Спаскага манастыра.

**Брылёва** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 125.

### *Буховічы – 465 гадоў з часу першага ўпамінання (1559)*

**Буховічы** (мясцовая назва Буховычы) - вёска, цэнтр Буховіцкага сельсавета. Вядома з XVI ст. як вёска і маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ. У 1559 г. маёнтак Буховічы знаходзіўся ва ўладанні братоў Галянішчавічаў. З 2007 г. – аграгарадок.

**Бухавічы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 126-127.

**Бухавічы** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1970 . - Т. 2. – С. 486.

**Бухавічы:** Назва населенага пункта паводле легендаў і паданняў // Брэстчына. – Мінск, 1995. – С. 265-268.

**Буховічы** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С 569.

**Буховичи** // Регионы Беларуси : энциклопедия. – В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1.- С. 220.

### *Бяроза – 465 гадоў з часу першага ўпамінання (1559)*

**Бяроза** (мясцовая назва Быроза) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. У 1559 г. Бяроза (Беразое) - маёнтак і сяло ў Кобрынскім павеце ВКЛ.

**Бяроза** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2.Брэсцкая вобласць. - С. 127-128.

**Бяроза** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С 570.

### *Грушава – 620 гадоў з часу першага ўпамінання (1404)*

**Грушава** (мясцовая назва Грушово) - вёска ў Гарадзецкім сельсавеце. Вядома з XV ст. як сяло Кобрынскага княства ВКЛ. У 1404 г. упамінаецца ў лісце князя Вітаўта сярод іншых населеных пунктаў, якія ён аддаў князю Раману Фёдаравічу (родапачынальнік князёў Кобрынскіх).

**Грушава** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007.- Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 137-138.

**Грушава** // Беларуская савецкая энцыклапедыя: у 12 т. – Мінск, 1971. - Т. 4. – С. 47.

**Грушава** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 575-576.

**Пятроўская, М.** У Грушаве адзначылі юбілей / Марыя Пятроўская // Кобрынскі веснік. – 2004. – 25 жніўня. – С. 2. - 600-годдзе з часу першага ўпамінання аб вёсцы.

### *Імянін – 505 гадоў з часу першага ўпамінання (1519)*

**Імянін** (мясцовая назва Мнянын) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. У 1519 г. маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ.

**Імянін** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 150.

**Імянін** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 583-584.

**Імяніны** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1971. - Т. 5. – С. 77.

**Летапіс** роднай старонкі : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 500-годдзя з часу першага ўпамінання в. Імянін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; уклад. : С. Д. Курачук, Т. М. Баранская. – Кобрын, 2019. – 40 с. : каляр. фота. - (Па вёсках нашага краю).

## *Ляскова – 465 гадоў з часу першага ўпамінання (1559)*

**Ляскова** (мясцовая назва Лыскова) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. У 1559 г. маёнтак і сяло Ляскоўскае, у Кобрынскім павеце ВКЛ, уладанне Рыгора і Фёдара Аглядовічаў.

**Ляскова** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 163-164.

**Ляскова** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 592.

## *Мінянка – 425 гадоў з часу першага ўпамінання (1599)*

**Мінянка** (мясцовая назва Міненка) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце, цэнтр калгаса «Звязда». Упамінаецца ў 1599 г.

**Мінянка** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 168.

**Мінянка** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1973. - Т. 7. – С. 254.

**Мінянка** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 595.

## *Навасадкі – 235 гадоў з часу першага ўпамінання (1789)*

**Навасадкі** (мясцовая назва Новосадкы) - вёска ў Хідрынскім сельсавеце. У 1789 г. у Азяцкім ключы Брэсцкай эканоміі ВКЛ, вёска, 4 валокі зямлі, 8 двароў, 44 жыхары, бровар, карчма (на арэндзе з 1709).

**Навасадкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 170.

**Навасадкі** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 596.

## *Падалессе – 425 гадоў з часу першага ўпамінання (1599)*

**Падалессе** (мясцовая назва Подоліссе) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце. Упершыню ўпамінаецца ў 1599 г.

**Падалессе** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007.- Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 173-174.

**Падалессе** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 598-599.

## *Паляцічы – 465 гадоў з часу першага ўпамінання (1559)*

**Паляцічы** (мясцовая назва Полятычы) - вёска ў Батчынскім сельсавеце. Вядомы з XVI ст. як сяло і маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ. У 1559 г. маёнтак, ва ўладанні В. Ц. Варашылы.

**Паляцічы** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 175-176.

**Паляцічы** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 599.

**Федорук, А. Т.** Полятичи / А. Т. Федорук // Старинные усадьбы Берестейщины. – Минск, 2004. – С. 500-501.

### *Патрыкі – 465 гадоў з часу першага ўпамінання (1559)*

**Патрыкі** - вёска ў Хідрынскім сельсавеце. У 1559 г. сяло і маёнтак Патрыкавічы ў Кобрынскім павеце ВКЛ, уладанні Я. С. Мрочкавіча са стрыечнымі братамі.

**Патрыкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 176.

**Патрыкі** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 600.

### *Прылукі Вялікія - 465 гадоў з часу першага ўпамінання (1559)*

**Прылукі Вялікія** (мясцовая назва Прылукы Вылыкы) - вёска ў Астроміцкім сельсавеце. У XVI ст. маёнтак і сяло ў Кобрынскім павеце ВКЛ. У 1559 г. маёнтак знаходзіўся ва ўладанні М. Лазаровіча з братамі.

**Прылукі** Вялікія // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя . - Мінск, 2007. -Т. 4 кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 180-181.

**Прылукі** Вялікія // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 603.

### *Ягалкі – 465 гадоў з часу першага ўпамінання (1559)*

**Ягалкі** (мясцовая назва Яголкы) - вёска ў Хідрынскім сельсавеце. У 1559 г. маёнтак у Кобрынскім павеце ВКЛ, уладанне С. Слібоўскага.

**Ягалкі** // Гарады і вёскі Беларусі : энцыклапедыя. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 197.

**Ягалкі** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 615.

### *Яромічы – 425 гадоў з часу першага ўпамінання (1599)*

**Яромічы** (мясцовая назва Еромычы) - вёска ў Буховіцкім сельсавеце, за 12 км ПнУ ад горада і чыгуначнай станцыі Кобрын., 58 км ад Брэста. Транспартныя сувязі па аўтадарозе Кобрын – Івацэвічы. Упамінаюцца ў 1599 г.

**Яромічы** // Гарады і вёскі Беларусі. - Мінск, 2007. - Т. 4, кн. 2. Брэсцкая вобласць. - С. 197-198.

**Яромічы** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 615.

# Памятныя даты вядомых людзей, жыццё і дзейнасць якіх звязана з краем

### *85 гадоў з дня нараджэння Н. В. Амельянюк (1939)*

**Амельянюк Ніна Васільеўна** нарадзілася ў 1939 г. у в. Лешня Капыльскага раёна. Закончыла гісторыка-геаграфічны факультэт Магілёўскага педагагічнага інстытута. Працавала настаўніцай у в. Азяты, у вячэрняй школе і СШ № 1 Кобрына. У 1979-1982 гг. - завуч, у 1982-1996 гг. - дырэктар СШ № 1 Кобрына. Выбіралася дэпутатам гарадскога Савета. Званне «Заслужаны настаўнік БССР» прысвоена ў 1978 г.

**Амельянюк Ніна Васільеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 429.

**Амельянюк Ніна Васільеўна** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С.105. : фат.

### *120 гадоў з дня нараджэння І. У. Анціпаровіча (1904)*

**Анціпаровіч Іван Усцінавіч** (1904–1993). Нарадзіўся ў 1904 г. у в. Мельнікі ў сялянскай сям'і. З прыходам Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь у верасні 1939 г. удзельнічаў у наладжванні работы органаў кіравання, арганізацыі народнай міліцыі ў Кобрыне. У чэрвені 1941 г. Анціпаровіч быў эвакуіраваны ў савецкі тыл, дзе служыў у органах унутраных спраў спачатку ў Яльцы, з 1943 г. - у Бранску. Пасля вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вярнуўся ў Кобрын. Да 1953 г. працаваў у Кобрынскім РАУС, пасля выхаду на пенсію - на ткацкай фабрыцы.

**Анціпаровіч Іван Усцінавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 113-114. – (Удзельнікі рэвалюцыйных выступленняў на Кобрыншчыне (1921-1939).

### *105 гадоў з дня нараджэння І .І. Арлова (1919)*

**Арлоў Іван Іванавіч** (1919-1943)**.** Нарадзіўся ў в. Бабакава Іванаўскай вобласці (Расія). Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны прызваны ў Чырвоную армію, у першыя дні вайны апынуўся ў акружэнні і застаўся на тэрыторыі Кобрынскага раёна. Вясной 1942 г. была арганізавана група, якая называла сябе чапаеўцамі, узначаліў яе І. І. Арлоў, пазней яна стала першым на Кобрыншчыне партызанскім атрадам імя Чапаева. 27 красавіка 1943 г. у час правядзення аперацыі Іван Арлоў быў цяжка паранены, схоплены і дастаўлены акупантамі ў Кобрын, дзе і памёр. У студзені 1944 г. на базе атрада імя Чапаева была створана партызанская брыгада імя Чапаева, а аднаму з атрадаў прысвоена імя Арлова.

**Арлоў Іван Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка – Мінск, 2002. - С. 213-214 – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

### *105 гадоў з дня нараджэння М. А. Астравуха (1919)*

**Астравух Мікалай Антонавіч** (1919-1943)**.** Нарадзіўся ў Мінскай вобласці. У 1940 г. прыехаў у Дзівінскі раён, працаваў старшынёй Павіццеўскага сельсавета, пазней - старшынёй Павіццеўскага сельскага спажывецкага таварыства. У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнічаў у арганізацыі партызанскіх атрадаў, быў сувязным. У 1943 г. стаў партызанам-разведчыкам. Восенню 1943 г. загінуў пры выкананні задання.

**Астравух Мікалай Антонавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 219. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *70 гадоў з дня нараджэння С. Д. Ашмянцава (1954)*

**Ашмянцаў Сяргей Дзмітрыевіч** нарадзіўся ў 1954 г. у в. Рай Манастыршчынскага раёна Смаленскай вобласці. У 1979-1990 гг. - намеснік старшыні па аўтатранспарце Кобрынскай райсельгастэхнікі, інструктар, загадчык сельскагаспадарчага аддзела Кобрынскага гаркама КПБ. У 1990-1995 гг. - старшыня калгаса імя Суворава Кобрынскага раёна. З 1995 па 2002 г. працаваў старшынёй Кобрынскага райвыканкама, з 2002 г. - намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама, з лютага 2007 г. – старшыня Брэсцкай абласнога Савета дэпутатаў. Узнагароджаны медалём «За працоўныя заслугі», прысвоена званне «Заслужаны працаўнік сельскай гаспадаркі Рэспублікі Беларусь».

**Ашмянцаў Сяргей Дзмітрыевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 449. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Брестский** областной Совет депутатов. Ашмянцев Сергей Дмитриевич // Брест. Брэст. Brest. 1000 / сост. А. Н. Вабищевич. – Минск, 2019. – С. 10.

**Ашмянцаў Сяргей Дзмітрыевіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 129. : фат.

### *110 гадоў з дня нараджэння Ф. М. Баранава (1914)*

**Баранаў Фёдар Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1914 г. Кадравы афіцэр Чырвонай арміі, служыў у Брэсцкай вобласці. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны трапіў у акружэнне пад Баранавічамі. Не маючы магчымасці выйсці з варожага тылу, разам з іншымі ваеннаслужачымі арганізаваў партызанскую групу, якая пазней была ўключана ў асобны атрад імя Шчорса, а потым пераўтворана ў самастойны атрад імя Суворава. Ф. М. Баранаў быў начальнікам штаба гэтага атрада, начальнікам штаба брыгады імя Дзяржынскага. У маі - ліпені 1944 г. Баранаў - камандзір партызанскай брыгады імя Чапаева, якая дзейнічала ў Кобрынскім і часткова Антопальскім раёнах. Брыгада прымала ўдзел у вызваленні Кобрынскага раёна. Узнагароджаны 3 ордэнамі. Пасля вайны жыў і працаваў у Маскве.

**Баранаў Фёдар Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 214-215. - (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

### *45 гадоў з дня нараджэння І. Г.供родзіч (1979)*

**Бародзіч Інга Генадзеўна** - спартсменка. Нарадзілася ў 1979 г. Майстар спорту Рэспублікі Беларусь па плаванні. Удзельніца Алімпійскіх гульняў у Атланце, неаднаразовая чэмпіёнка Рэспублікі Беларусь па плаванні.

**Бародзіч Інга Генадзеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

### *125 гадоў з дня нараджэння Д. С. Барысюка (1899)*

**Барысюк Дзмітрый Сцяпанавіч** (1899-1943)**.** Нарадзіўся ў в. Турная. У час Першай сусветнай вайны знаходзіўся ў эвакуацыі. З 1917 г. па 1922 г. - у Чырвонай арміі. У 1923 г. вярнуўся ў в. Турная. Член КПЗБ з 1925 г. У Вялікую Айчынную вайну пры актыўным удзеле Д. С. Барысюка ў ліпені 1941 г. створаны Турнянскі антыфашысцкі камітэт, які падтрымліваў сувязь з усімі партызанскімі атрадамі, што дзейнічалі на тэрыторыі Кобрынскага раёна, а таксама з атрадам імя Суворава Пінскага партызанскага злучэння. Д. С. Барысюк загінуў у сакавіку 1943 г. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

**Барысюк Дзмітрый Сцяпанавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 86, 219. – (Удзельнікі Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, Змагаліся ў тыле ворага).

### *110 гадоў з дня нараджэння А. К. Букрабы (1914)*

**Букраба Аляксандр Кірылавіч** (1914-1977). Нарадзіўся ў 1914 г. у в. Навасёлкі ў сялянскай сям'і. Удзельнік Кобрынскага (Навасёлкаўскага) узброенага выступлення сялян 1933 г. У 1940-1941 гг. сакратар Навасёлкаўскага валаснога выканкама, дырэктар школы. У Вялікую Айчынную вайну партызан атрада імя Суворава, камісар атрада імя Арджанікідзе брыгады імя Молатава. Пасля вайны працаваў намеснікам старшыні Дзівінскага, старшынёй Дзівінскага, Пружанскага і Антопальскага райвыканкамаў, 1-м

сакратаром Шарашоўскага і Пружанскага райкамаў КП(б)Б. Са студзеня 1963 г. старшыня Брэсцкага аблсаўпрофа. З верасня 1965 г. і да выхаду на пенсію (1975) - старшыня парткамісіі пры Брэсцкім абласным камітэце КПБ. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнам ПНР «Віртуці Мілітары» (залаты крыж) і інш.

**Букраба Аляксандр Кірылавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 214-215. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

**Букраба Аляксандр Кірылавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 36. : фат.

### *95 гадоў з дня нараджэння А. М. Булавіцкага (1929)*

**Булавіцкі Аляксандр Мікалаевіч.** Нарадзіўся 28 кастрычніка 1929 г. у в. Чахец Пружанскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1954-1966 гг.- інструктар Пружанскага райкама, Брэсцкага абкама, 1-ы сакратар Шарашоўскага, Кобрынскага райкамаў ЛКСМБ, старшыня калгаса «Запаветы Ільіча» Кобрынскага раёна. У 1966-1968 гг. старшыня Кобрынскага райвыканкама. З 1968 г. старшыня калгаса «Сцяг Перамогі» Кобрынскага раёна, з 1981 г. старшыня Гарадзецкага міжгаспадарчага аб'яднання, з 1982 г. старшыня калгаса-камбіната імя Ф. Э.Дзяржынскага. Першы старшыня Савета калгасаў Брэсцкай вобласці. Узнагароджаны ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі, Працоўнага Чырвонага Сцяга, іншымі ўзнагародамі.

**Булавіцкі Аляксандр Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 450. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Булавіцкі Аляксандр Мікалаевіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 36-37. : фат

### *70 гадоў з дня нараджэння В. А. Бялінскага (1954)*

**Бялінскі Віталь Андрэевіч** нарадзіўся 5 жніўня 1954 г. у в. Даўганосы Ковельскага раёна Валынскай вобл. (Украіна). Закончыў Брэсцкі інжынерна-будаўнічы інстытут (1976). Працаваў майстрам ПМК-80 трэста «Слуцксельбуд», майстрам, прарабам, старшым прарабам будупраўлення № 31 у Пінску. З 1984 г. начальнік лабараторыі будтрэста № 2 Пінска, з 1986 г. інструктар Пінскага гаркама КПБ. Потым кіраваў жыллёва-камунальнай гаспадаркай (ЖКГ) Пінска, з 1997 г. першы намеснік начальніка вытворчага ўпраўлення ЖКГ Брэсцкага аблвыканкама. З 17.04.2001 г. да лютага 2002 г. - старшыня Кобрынскага гарвыканкама.

**Бялінскі Віталь Андрэевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 450. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

### *125 гадоў з дня нараджэння В. І. Вайткоўскай (1899)*

**Вайткоўская Варвара Ігнацьеўна** (1899-1981). Нарадзілася 4 снежня 1899 г. Закончыла Екацярынаслаўскую жаночую гімназію (1918). У чэрвені 1940 г. - чэрвені 1941 г. - супрацоўнік рэдакцыі чырвона-армейскай газеты «Час Родины» ў Кобрыне, у ліпені 1941 г. - сакавіку 1944 г. - газеты «В бой за Родину» на Карэльскім фронце. Пасля вайны жыла і працавала ў Кобрыне. Узнагароджана медалямі.

**Вайткоўская Варвара Ігнацьеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 240. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *125 гадоў з дня нараджэння Л. Т. Валасюка (1899)*

**Валасюк Лука Трафімавіч.** Нарадзіўся ў 1899 г. у Батчы. Закончыў настаўніцкія курсы ў г. Роўна (1940). У 1921-1923 гг. служыў у Польскай арміі. З канца 1923 г. сакратар Кобрынскага падпольнага райкама КПЗБ. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны дапамагаў палонным байцам Чырвонай арміі, сем'ям савецкіх ваеннаслужачых. Пазней сувязны партызанскага атрада імя Чапаева. Удзельнік вызвалення Кобрына. Пасля вайны працаваў старшынёй калгаса.

**Валасюк Лука Трафімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 234. – (Яны вызваляли Кобрыншчыну).

### *95 гадоў з дня нараджэння В. А. Вараб'ёва (1929)*

**Вараб'ёў Вадзім Андрэевіч** нарадзіўся 6 мая 1929 г. у Брэсце. Закончыў Вольскае авіяцыйнае тэхнічнае вучылішча ВПС (1954), Ленінградскую вышэйшую школу міліцыі (1966). У Вялікую Айчынную вайну ўдзельнік Брэсцкага падполля, сувязны Старасельскага партызанскага атрада (пазней імя Чарнака), з верасня 1943 г. - разведчык атрада імя Шчорса. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

**Вараб'ёў Вадзім Андрэевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 234. – (Яны вызваляли Кобрыншчыну).

### *85 гадоў з дня нараджэння І. Б. Венцэля (1939)*

**Венцэль Іван Баляслававіч** нарадзіўся 2 студзеня 1939 г. у г. Ляхавічы Брэсцкай вобласці. З 1965 г. - другі сакратар Лунінецкага райкама ЛКСМБ, першы сакратар Драгічынскага райкама ЛКСМБ, намеснік загадчыка аддзела Брэсцкага абкама ЛКСМБ. У 1975-1982 гг. сакратар, другі сакратар Кобрынскага гаркама КПБ. У 1982-1988 гг. - старшыня Кобрынскага райвыканкама. У 1988-1995 гг. - старшыня Брэсцкага гарвыканкама.

**Венцэль Іван Баляслававіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 450-451 – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

### *95 гадоў з дня нараджэння Я. А. Воўка (1929)*

**Воўк Яўген Арсенцьевіч** (1929-1986). Палкоўнік медыцынскай службы, кандыдат медыцынскіх навук. Нарадзіўся ў 1929 годзе ў в. Мярніца Кобрынскага павета (цяпер в. Мярніца Кобрынскага раёна). Яўген Арсенцьевіч - заслужаны ўрач Узбекістана.

**Воўк Яўген Арсенцьевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).
**Воўк Яўген Арсенцьевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 21.

### *100 гадоў з дня нараджэння М. Ф. Галаднюка (1924)*

**Галаднюк Мікалай Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. Кустовічы. У Вялікую Айчынную вайну сувязны партызанскіх груп, партызан атрада імя Кірава. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына, Чэхаславакіі. Дзень Перамогі сустрэў у Германіі. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрыне.

**Галаднюк Мікалай Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 234. - (Яны вызваляли Кобрыншчыну).

### *65 гадоў з дня нараджэння С. А. Гардуна (1959)*

**Гардун Сяргей Аляксеевіч (Сергій Гардун)** - святар і вучоны, прафесар, мітрафорны протаіерэй, кандыдат багаслоўя (1990), дацэнт (2000). Ён змяшчае ў сваёй асобе навукоўца і клірыка. Нарадзіўся 4 сакавіка 1959 г. у в. Дзівін. Закончыў Мінскі педагагічны інстытут замежных моў (1976), Маскоўскую духоўную акадэмію (1986). Працаваў настаўнікам Маскоўскай духоўнай семінарыі. З 1989 г. працуе ў Мінскай духоўнай семінарыі, дацэнт Мінскай духоўнай акадэміі, дацэнт кафедры багаслоўскіх дысцыплін факультэта тэалогіі Еўрапейскага гуманітарнага ўніверсітэта.

**Гордун Сяргей Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432.

**Гапанович, А. Н.** Сергей Алексеевич Гордун / Афанасий Гапанович // Дивин — древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 70. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Гардун Сяргей Аляксеевіч //** Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 27-29.

**Вядомыя** людзі, ураджэнцы в. Дзівін. Гардун Сяргей Аляксеевіч // Дзівінскі шлях: гісторыя і дзень сённяшні : гісторыка-краязнаўчы нарыс да 550-годдзя з часу першага ўпамінання в. Дзівін Кобрынскага раёна / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 36.

**Гардун, С. А.** «Сімвал Беларусі» / [Сергій Гардун ; гутарыла] Ніна Шчарбацэвіч // Звязда. - 2019. — 10 студзеня. — С. 1, 13. - Перакладчыкі Бібліі на родную мову, сярод якіх С. А. Гардун, ўшанаваны высокай узнагародай.

### *105 гадоў з дня нараджэння М. З. Глёка (1919)*

**Глёк Міхаіл Зоцікавіч** (1919-1997). Нарадзіўся 15 кастрычніка 1919 г. у в. Паляцічы. У Вялікую Айчынную вайну са жніўня 1944 г. служыў у 1340-м стралковым палку 234-й стралковай дывізіі 1-га Беларускага фронту, аўтаматчык. Удзельнічаў у баях на тэрыторыі Германіі, Польшчы, у штурме Берліна. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

**Глёк Міхаіл Зоцікавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 241. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *100 гадоў з дня нараджэння М. П. Грома (1924)*

**Гром Мікалай Пятровіч.** Нарадзіўся 14 снежня 1924 г. у в. Ліпава. Закончыў Гродзенскае культурна-асветнае вучылішча. У Вялікую Айчынную вайну са снежня 1943 г. партызанскі сувязны, потым у партызанскай брыгадзе «За Радзіму» імя Флегантава. З лета 1944 г. у Чырвонай арміі. Удзельнічаў у вызваленні гарадоў Брэст, Ратна (Украіна), Гдыня, Торунь (Польшча) і інш. Дзень Перамогі сустрэў у Берліне.

**Гром Мікалай Пятровіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 241. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *120 гадоў з дня нараджэння А. В. Грышкоўскага (1904)*

**Грышкоўскі Аляксей Васільевіч** (1904-1990). Генерал-маёр (1945). Нарадзіўся 10 мая 1904 г. у в. Мярніца. Закончыў Ваенную акадэмію імя Дзяржынскага (1940). З 1918 г. у Чырвонай арміі. Вялікую Айчынную вайну пачаў пад Ленінградам камандзірам артылерыйскага палка ў чыне маёра. Удзельнічаў у вызваленні Украіны, у баях у Польшчы, Чэхаславакіі. Вайну закончыў у Германіі камандуючым артылерыяй 18-й арміі ў чыне генерал-маёра. Пасля вайны камандуючы артылерыяй арміі, намеснік камандуючага

артылерыяй ваеннай акругі, начальнік факультэта Артылерыйскай радыётэхнічнай акадэміі імя Говарава, дырэктар саўгаса «3-і рашаючы» пад Харкавам.

**Грышкоўскі Аляксей Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

### *80 гадоў з дня нараджэння Г. Р. Гулюка (1944)*

**Гулюк Георгій Рыгоравіч** - дзяржаўны дзеяч, кандыдат сельскагаспадарчых навук. Нарадзіўся 23 ліпеня 1944 г. у в. Дварэц (Яромічы). Закончыў Горэцкую сельска-гаспадарчую акадэмію. Працаваў прарабам у Яроміцкай МТС, начальнікам ПМК у г. Маларыта, намеснікам міністра, міністрам меліярацыі СССР. У наш час Г. Г. Гулюк працуе дырэктарам Дэпартамента меліярацыі і тэхнічнага забеспячэння Міністэрства сельскай гаспадаркі Расійскай Федэрацыі. Ён віцэ-прэзідэнт Міжнароднай камісіі па ірагацыі і дрэнажу, член калегіі Міністэрства сельскай гаспадаркі РФ. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За преобразование Нечерноземья РСФСР» і 8 медалямі. Заслужаны меліяратар Расійскай Федэрацыі.

**Гулюк Георгій Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**Гулюк Георгій Рыгоравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 32-33.

**Гулюк Георгій Рыгоравіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 147. : фат.

### *60 гадоў з дня нараджэння Л. В. Дарошак (1964)*

**Дарошак Любоў Васільеўна** - дацэнт Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, спецыяліст па менеджменту. Выпускніца 1964 года сярэдняй школы № 1 г. Кобрына. Пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя У. І. Леніна была размеркавана на работу ў навукова-даследчы інстытут пры Дзяржплане БССР. Потым практычна ўсё жыццё Л. Дарошак (з 1974 г. па 2007 г.) звязана з выкладаннем у Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі (цяпер Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт). Прайшла шлях ад асістэнта да дацэнта ўніверсітэта. З 2007 г. Л. В. Дарошак працуе ў Прыватным інстытуце кіравання і прадпрымальніцтва.

**Дорошек, Л. В**. Основы менеджмента : учебно-практическое пособие / Л. В. Дорошек [и др.]. – Минск : БГЭУ, 2004.

**Дарошак Любоў Васільеўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 36-37.

### *60 гадоў з дня нараджэння М. М. Дземідовіча (1964)*

**Дземідовіч Мікалай Мікалаевіч** (1964-1984). Нарадзіўся 17 снежня 1964 г. у в. Гарадзец Кобрынскага раёна. У 1982 г. закончыў Гарадзецкую сярэднюю школу, дапрызыўную падрыхтоўку прайшоў у Брэсцкай аўташколе ДТСААФ. У кастрычніку 1983 г. быў накіраваны ў Афганістан. 25 снежня 1984 г. Мікалай загінуў. Узнагароджаны медалём. Пахаваны на могілках в. Гарадзец.

**Дземідовіч Мікалай Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 444–445. – (Загінулі ў Афганістане).

### *105 гадоў з дня нараджэння А. І. Дзеравянкі (1919)*

**Дзеравянка Андрэй Іванавіч.** Нарадзіўся 31 кастрычніка 1919 г. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 года да мая 1945 г. на фронце. Камандзір 669-га стралковага палка маёр А. І. Дзеравянка ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына. Узнагароджаны 2 ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Дзеравянка Андрэй Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 235. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *80 гадоў з дня нараджэння Р. Г. Запарожчанка (1944)*

**Запарожчанка Раіса Георгіеўна** - вучоны-фізік, доктар фізіка-матэматычных навук. Нарадзілася 25 лютага 1944 г. ў в. Мярніца Кобрынскага раёна. У 1966 г. скончыла фізічны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. У 1977 г. абараніла кандыдацкую дысертацыю. Надрукавала больш за 100 навуковых артыкулаў у айчынных і замежных часопісах, атрымала 9 аўтарскіх пасвед-чанняў на вынаходствы. Па выніках гэтых даследаванняў у 1996 г. ёй прысвоена навуковая ступень доктара фізіка-матэматычных навук па спецыяльнасці «лазерная фізіка». Раіса Георгіеўна - вядучы навуковы супрацоўнік Інстытута фізікі імя Б. І. Сцяпанава Нацыянальнай АН Беларусі.

**Запарожчанка Раіса Георгіеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 434-435. – (Імі ганарацца землякі).

**Запарожчанка Раіса Георгіеўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 45-46.

### *125 гадоў з дня нараджэння О. Зарыскага (1899)*

**Зарыскі Оскар** (1899–1986). Сапраўдныя імя і прозвішча Ошэр Зарыцкі; англ. Oscar Zariski. Амерыканскі матэматык. Нарадзіўся 24 красавіка 1899 г. у г. Кобрыне. У 1927 г. О. Зарыскі эмігрыруе ў ЗША, дзе працуе ва ўніверсітэце Джона Хопкінса, затым у Гарвардскім універсітэце. Асноўныя працы вучонага ў галіне алгебры. О. Зарыскі выказаў знакамітую гіпотэзу аб уласцівасцях алгебраічных многачленаў (гіпотэза Зарыскага). У 1944 г. геніяльны матэматык быў удастоены прэміі Коўла за выдатны ўклад у алгебру. У 1965 г. Зарыскага ўзнагародзілі Нацыянальным навуковым медалём ЗША, які прысуджаецца Прэзідэнтам краіны. Оскар Зарыскі - лаўрэат прэміі Вольфа за 1981 г.

**Касцюковіч, М. М.** Зарыскі Оскар / М. М. Касцюковіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2004. – Т. 18, кн. 1. – С. 388.

**Зарыскі Оскар //** Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 46-48.

### *120 гадоў з дня нараджэння Б. Р. Ільясюка (1904)*

**Ільясюк Барыс Рыгоравіч** (1904-1989). Нарадзіўся 24 ліпеня 1904 г. у в. Пецькі. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР працаваў настаўнікам, інспектарам райана, дырэктарам дзіцячай тэхнічнай школы Кобрына. У Вялікую Айчынную вайну з 1941 г. на фронце. З 1943 г. працаваў у Саўнаркоме Удмурцкай АССР. У 1944 г. вярнуўся ў Кобрын. З 1948 г. старшыня, з 1959 г. сакратар Кобрынскага гарвыканкама. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, Славы III ступені, 9 медалямі.

**Ільясюк Барыс Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 242, 452.

### *100 гадоў з дня нараджэння З. Кабаты (1924)*

**Кабата Збігнеў** (1924-2014). Брытанскі і канадскі паразітолаг, доктар біялагічных і філасофскіх навук, ганаровы член Паразіта-лагічнага грамадства. Нарадзіўся 17 сакавіка 1924 г. у в. Яромічы Кобрынскага павета (цяпер Кобрынскага раёна) у сям'і афіцэра. У 1966 г. З. Кабаце прысвоена званне доктара біялагічных і філасофскіх навук. Кабата прысвяціў больш 50 гадоў працы па сістэматыцы і цыклам паразітычных капепод. Як прызнанне заслуг Кабаты, яго імем названа некалькі дзясяткаў марскіх істот. З. Кабата адзначаны шматлікімі медалямі за прафесійную і грамадскую дзейнасць, сярод якіх узнагароды Канадскага грамадства заолагаў, Польскага паразіталагічнага грамадства. Памёр 4 ліпеня 2014 г.

**Доктор** Збигнев Кабата // Паразитология. – 2015. – Т. 49. В. 1. – С. 72-74. – Паразитологическое общество.

**Кабата Збігнеў //** Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 57-58.

### *110 гадоў з дня нараджэння А. М. Караваева (1914)*

**Караваеў Аляксандр Мікалаевіч.** Нарадзіўся ў 1914 г. у в. Танкавічы Сяроўскага раёна Свярдлоўскай вобласці (Расія). З ліпеня 1940 г. служыў у складзе 182-га асобнага сапёрнага батальёна на тэрыторыі Літвы. У 1942-1944 гг. у партызанскім атрадзе імя Катоўскага, намеснік камандзіра атрада па разведцы. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны ІІ ступені, медалямі. З ліпеня 1944 г. да ліпеня 1946 г. працаваў старшынёй Дзівінскага райвыканкама. У канцы 1946 г. выехаў на Урал.

**Караваеў Аляксандр Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 215. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

### *130 гадоў з дня нараджэння Д. А. Каранчука (1894)*

**Каранчук Даніла Аляксеевіч** (1894-1986)**.** Нарадзіўся 21 снежня 1894 г. у в. Лягаты. У гады грамадзянскай вайны ваяваў пад Рыгай, у цэнтральных раёнах і на поўдні Расіі. У гады Вялікай Айчыннай вайны прымаў удзел у фарміраванні маршавых рот, быў намеснікам камандзіра часці па гаспадарчых пытаннях у г. Пугачоў Саратаўскай вобласці (Расія). Пасля дэмабілізацыі ў 1946 г. вярнуўся ў Кобрын. З 1947 г. дырэктар харчкамбіната, працаваў у гархарчгандлі, райгандлі, загадчыкам райсабеса, архіварыусам.

**Каранчук Даніла Аляксеевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. -С. 242-243. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *100 гадоў з дня нараджэння П. Р. Каранчука (1924)*

**Каранчук Павел Рыгоравіч** (1924-2012)**.** Нарадзіўся ў в. Магдалін**.** З 1948 г. працаваў старшынёй калгаса «Новы шлях» Кобрынскага раёна, які быў у ліку тых гаспадарак, на базе якіх праводзіліся рэспубліканскія семінары па сельскай гаспадарцы. Першы сакратар ЦК КПБ П. М. Машэраў бываў у гэтай гаспадарцы неаднаразова. Будучы пенсіянерам, П. Р. Каранчук актыўна працаваў у ветэранскіх арганізацыях, быў старастам в. Магдалін. У 1985 г. Павел Рыгоравіч захапіўся тапаніміяй. У мясцовай газеце «Кобрынскі веснік» апублікаваны шэраг артыкулаў пад рубрыкай «Деревенька моя». У час падрыхтоўкі, збору матэрыялаў і выдання кнігі «Памяць. Кобрынскі раён» прымаў актыўны ўдзел у яе выданні. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, «Знак Пашаны», іншымі ўзнагародамі. Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна.

**Долготович, Б. Д**. Коренчук Павел Григорьевич / В. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов : биографический справочник / Б. Д. Долготович. – Минск, 2008. – С. 30-31.

**Каранчук Павел Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 427. – (Вызначыліся працай).

**Павел Григорьевич Коренчук** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Павел Григорьевич Коренчук** : [биографический очерк] : альбом. – Магдалин, 2003. - 19 с. : фото.

**Каранчук Павел Рыгоравіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі : інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 38-41 : каляр. іл.

### *120 гадоў з дня нараджэння М. П. Карповіча (1904)*

**Карповіч Максім Пятровіч**. Нарадзіўся ў 1904 г. у в. Асмолавічы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. У пасляваенныя гады калгаснік, брыгадзір паляводчай брыгады ў калгасе «Шлях Леніна» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966).

**Карповіч Максім Пятровіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 427. - (Вызначыліся працай).

**Карповіч Максім Пятровіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 54. : фат.

### *115 гадоў з дня нараджэння Х. М. Касымава (1909)*

**Касымаў Хамза Мірсайхавіч.** Нарадзіўся ў 1909 г. у в. Ахметава, Башкірыя. У гады Вялікай Айчыннай вайны са жніўня 1942 г. да сакавіка 1943 г. намеснік камандзіра палка 16-й Башкірскай кавалерыйскай дывізіі. З мая 1943 г. да ліпеня 1944 г. партызан атрада імя Катоўскага, у маі - ліпені 1944 г. камісар атрада. Са снежня 1944 г. да мая 1945 г. у Чырвонай арміі, камандзір палка. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны І і ІІ ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны жыў у г. Уфа.

**Касымаў Хамза Мірсайхавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 215. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

### *185 гадоў з дня нараджэння І. А. Катовіча (1839)*

**Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч** (1839-1915). Праваслаўны царкоўны дзеяч, гісторык, публіцыст, журналіст і фальклярыст. Магістр багаслоўя (1873). Іван Катовіч, старэйшы сын протаіерэя Антонія Ануфрыевіча Катовіча, нарадзіўся ў 1839 г. у в. Чаравачыцы Кобрынскага павета Гродзенскай губерні. Атрымаў адукацыю ў Кобрынскім духоўным вучылішчы. Скончыў Літоўскую духоўную семінарыю, Пецярбургскую духоўную акадэмію. Выкладаў у Кобрынскім і Віленскім духоўных вучылішчах, Віленскім рэальным вучылішчы. З 1875 г. ён протаіерэй, настаяцель Віленскага Прачысценскага сабора. У 1869-1903 гг. І. А. Катовіч - рэдактар «Литовских епархиальных ведомостей», у якіх змясціў шмат артыкулаў па царкоўных пытаннях. Іван Антонавіч быў членам Паўночна-Заходняга аддзела Рускага геаграфічнага таварыства. Даследаваў гісторыю распаўсюджвання хрысціянства на Беларусі, праваслаўных храмаў Кобрына, Вільні.

**Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч** // Асветнікі зямлі Беларускай : энцыклапедычны даведнік. – Мінск, 2001. – С. 223.

**Котович Иван (Иоанн) Антонович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. – Кн. 1. - С. 505-506.

**Чарапіца, В.** Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч / Валерый Чарапіца // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1997. – Т. 4. – С. 149.

**Катовіч Іван (Іаан) Антонавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 65-66.

## *105 гадоў з дня нараджэння У. М. Кірмановіча (1919)*

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** (1919-2001). Герой Савецкага Саюза (1945), палкоўнік (1958). Нарадзіўся 5 ліпеня 1919 г. у Кобрыне. Закончыў курсы малодшых лейтэнантаў (1942), Ваенную акадэмію імя Фрунзе (1955). У Вялікую Айчынную вайну з мая 1942 г. на Бранскім, Цэнтральным, 3-м і 4-м Украінскіх, 1-м і 2-м Прыбалтыйскіх франтах. Камандзір знішчальнай процітанкавай батарэі капітан У. М. Кірмановіч вызначыўся пры вызваленні Латвіі. 22 жніўня 1944 г. у час танкавай контратакі праціўніка ў раёне пас. Букайшы Добельскага раёна батарэя на чале з У. М. Кірмановічам першая прыняла ўдар, падбіла і спаліла 6 танкаў, 3 самаходныя гарматы, што спрыяла паспяховаму наступленню савецкіх войскаў. За гэты подзвіг У. М. Кірмановіч быў удастоены звання Героя Савецкага Саюза. З 1960 г. выкладчык Харкаўскага ваенна-авіяцыйнага вучылішча імя двойчы Героя Савецкага Саюза С. І. Грыцаўца. На будынку кобрынскай СШ № 2, у якой вучыўся У. М. Кірмановіч, устаноўлена мемарыяльная дошка. 12 кастрычніка 2005 г. было прынята рашэнне аб прысваенні ў г. Кобрыне вуліцы імя Кірмановіча. Ганаровы грамадзянін г. Кобрына.

**Долготович, Б. Д.** Кирманович Владимир Николаевич / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. – Минск, 2008. – С. 30.

**Залатая** зорка Кобрына. Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 239.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Ваенная энцыклапедыя Беларусі = Военная энциклопедия Беларуси. – Мінск, 2010. – С. 516-517.

**Кирманович Владимир Николаевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. - Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 454.

**Кірмановіч Уладзімір Мікалаевіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі : інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 11-14. : каляр. іл.

## *60 гадоў з дня нараджэння М. М. Кірысюка (1964)*

**Кірысюк Міхаіл Мікалаевіч** (1964-1984). Малодшы сяржант. Нарадзіўся 7 верасня 1964 г. у в. Хабовічы Кобрынскага раёна. У 1979 г. закончыў Хабовіцкую васьмігадовую школу, у 1980 г. - ПТВ № 102 г. Кобрына, пасля працаваў у ПМК № 70. У маі 1983 г. прызваны ў рады Савецкай арміі, служыў у Беларускай ваеннай акрузе. У верасні 1983 г. быў накіраваны ў Афганістан у якасці камандзіра аддзялення. Памёр 1.03.1984 г. Пахаваны на могілках в. Хабовічы.

**Кірысюк Міхаіл Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 445. – (Загінулі ў Афганістане).

**Кірысюк Міхаіл Мікалаевіч** // Памяць. Афганістан. –Мінск, 1991. - С. 207 : фат.

### *75 гадоў з дня нараджэння С. М. Кірычука (1949)*

**Кірычук Сцяпан Міхайлавіч** - кандыдат тэхнічных навук (1999), доктар сацыялагічных навук, дацэнт, ганаровы прафесар Цюменскай дзяржаўнай архітэктурна-будаўнічай акадэміі, сапраўдны член Муніцыпальнай акадэміі Расійскай Федэрацыі. Нарадзіўся 18 мая 1949 г. у в. Мазуры Кобрынскага раёна. Займаў кіраўнічыя пасады ў Цюменскім абкаме КПСС. Пасля распаду СССР чатырохразова выбіраўся мэрам Цюмені на прамых усенародных выбарах. У наш час С. І. Кірычук - старшыня Камітэта Савета Федэрацыі па пытаннях мясцовага самакіравання, член камісіі Савета Федэрацыі па натуральных манаполіях, прадстаўнік ад выканаўчага органа дзяржаўнай улады Цюменскай вобласці. Сцяпан Міхайлавіч - аўтар шматлікіх навуковых прац. Узнагароджаны медалём «За освоение недр и развитие нефтегазового комплекса Западной Сибири» (1981), ордэнам Дружбы народаў (1986), ордэнам «За заслуги перед Отечеством» IV ступені (2010), Ганаровай граматай Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі.

**Кірычук Сцяпан Міхайлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 71.

**Кто есть** кто. Киричук Степан Михайлович [Электронный ресурс] // Деловой Петербург. – Режим доступа: http://whoiswho. dp.ru/cart/ person/ 1930889/. – Дата доступа: 18.09.2017.

### *105 гадоў з дня нараджэння В. Р. Коўтуна (1919)*

**Коўтун Васіль Рыгоравіч** нарадзіўся ў 1919 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце са снежня 1941 г., служыў старшыной дывізіёна ў 60-м гвардзейскім Кобрынскім артылерыйскім палку. Удзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны медалямі.

**Коўтун Васіль Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 235. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *115 гадоў з дня нараджэння Р. М. Кошаля (1909)*

**Кошаль Рыгор Міхайлавіч** нарадзіўся ў 1909 г. у г. Смалявічы Мінскай вобласці. У кастрычніку 1939 г. працаваў у Кобрыне на пасадзе галоўнага бухгалтара міжраённай канторы «Белгандальплодаагародніна». У 1942 г. устанавіў сувязь з партызанамі, у 1943 пайшоў у партызанскі атрад імя Катоўскага, быў старшым дыверсійнай групы. У 1944 г. разам з атрадам выйшаў за лінію фронту.

**Кошаль Рыгор Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 221. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *145 гадоў з дня нараджэння П. А. Крачэўскага (1879)*

**Крачэўскі Пётр Антонавіч** (1879–1928) - гісторык, беларускі палітычны і грамадска-культурны дзеяч, паэт, драматург. Дэлегат I Усебеларускага Кангрэсу, Прэзідэнт Рады БНР. Нарадзіўся 7 жніўня 1879 г. у Кобрынскім павеце Гродзенскай губерні ў сям'і дыякана вясковай царквы. У эміграцыі, у Празе, П. Крачэўскі стварыў прадстаўніцтва Рады БНР, разгарнуў шырокую дыпламатычную дзейнасць Удзельнік Першай Усебеларускай палітычнай канферэнцыі ў Празе-Чэшскай у верасні 1921 года. Пётр Антонавіч Крачэўскі выявіў сябе як здольны публіцыст, гісторык і паэт.

**Крачэўскі (Крэчэўскі) Пётр Антонавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. - Мінск, 1999. - Т. 8. - С.470.

**Крачэўскі (Крэчэўскі) Пётр Антонавіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] – Мінск, 2012. – Т. 4. – С. 567.

**Мазец, В.** Крачэўскі Пётр Антонавіч / Валянцін Мазец // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 1997. - Т. 4. - С. 256.

**Памяткі** нашай мінуўшчыны. Пётр Крачэўскі // Берасцейскія карані : гісторыка-краязнаўчы і літаратурны зборнік. – Брэст, 1993. – С. 97.

**Крачэўскі Пётр Антонавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 77-79.

### *75 гадоў з дня нараджэння М. А. Крывецкага (1949)*

**Крывецкі Мікалай Анатольевіч.** Нарадзіўся 5 красавіка 1949 г. у в. Малінаўка Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1975-1985 гг. інструктар Драгічынскага райкама КПБ, намеснік начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі Драгічынскага райвыканкама, інструктар, намеснік загадчыка сельскагаспадарчага аддзела Брэсцкага абкама, другі сакратар Маларыцкага райкама КПБ, старшыня Іванаўскага райвыканкама. У 1985-1991 гг. - першы сакратар Кобрынскага гаркама КПБ. З сакавіка да снежня 1991 г. - намеснік старшыні Савета калгасаў Брэсцкай вобласці. У апошні час кіраўнік Адміністрацыі свабоднай эканамічнай зоны «Брэст». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, іншымі ўзнагародамі.

**Крывецкі Мікалай Анатольевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 453. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Крывецкі Мікалай Анатольевіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 58-59. : фат.

### *85 гадоў з дня нараджэння В. У. Курашыка (1939)*

**Курашык Віталій Уладзіміравіч** - акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі, Ганаровы доктар Міжнароднай кадравай акадэміі. Нарадзіўся Віталій Курашык 8 мая 1939 г. у в. Дзівін. З 1982 г. жыве ў Крыму. У 1982-1985 гг. старшыня гарвыканкама г. Еўпаторыі (Крым). У 1985-1987 гг. - загадчык аддзела Крымскага абкама КПУ, у 1987-1991 гг. - намеснік старшыні, першы намеснік старшыні, старшыня Крымскага аблвыканкама. У 1991-1993 гг. В. У. Курашык - старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Крым. З мая 1993 г. па 14 чэрвеня 2001 г. - Надзвычайны і Паўнамоцны пасол Рэспублікі Беларусь ва Украіне. З 2003 г. - саветнік Прадстаўніка Прэзідэнта ААТ «Лукойл» ва Украіне. За сваю дзейнасць ва Украіне і Беларусі В. У. Курашык узнагароджаны ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга і «За заслугі» III ступені (Україна), а таксама ганаровымі граматамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, Кабінета Міністраў Украіны і іншымі ўзнагародамі. В. У. Курашык - Ганаровы грамадзянін г. Еўпаторыі. У 2010 г. выйшла кніга В. У. Курашыка «Я не хочу судьбу иную…(Записки дипломата)», у якой ён шмат старонак прысвяціў сваёй малой радзіме в. Дзівін.

**Курашик Виталий Владимирович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область: в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 517.

**Курашык Віталь Уладзіміравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 437 : фота.

**Гапанович, А. Н.** Виталий Владимирович Курашик / Афанасий Гапанович // Дивин - древний и молодой / Афанасий Гапанович. - Брест, 2017. - С. 72, 73. - (Известные уроженцы и жители Дивина).

**Шпакова, Н. В**. Курашик Віталій / Н. В. Шпакова // Українська дипломатична енциклопедія : у 2-х т. – Киев : Знання України, 2000. - Т. 1.

### *120 гадоў з дня нараджэння Д. К. Курышкі (1904)*

**Курышка Дзмітрый Кузьміч** (1904-1984)**.** Нарадзіўся ў 1904 г. у в. Балоты. Удзельнічаў у арганізацыі партызанскіх атрадаў. З ліпеня 1943 г. да ліпеня 1944 г. партызан-разведчык атрада імя Катоўскага. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны працаваў у Кобрыне.

**Курышка Дзмітрый Кузьміч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 222. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *105 гадоў з дня нараджэння М. М. Ламейкі (1919)*

**Ламейка Міхаіл Мікалаевіч** (1919-1977). Нарадзіўся ў 1919 г. у в. Вішнёўка Івацэвіцкага раёна Брэсцкай вобласці. З верасня 1942 г. Міхаіл Мікалаевіч баец атрадаў імя Шчорса і «Савецкая Беларусь», з красавіка 1943 г. да красавіка 1944 г. - партызанскага атрада імя Катоўскага. Узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга, медалямі. Пасля вайны працаваў у паравозным дэпо Брэста.

**Ламейка Міхаіл Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 222. (Змагаліся ў тыле ворага).

### *90 гадоў з дня нараджэння В. Л. Леанюка (1934)*

**Леанюк Віктар Лук'янавіч** нарадзіўся 3 снежня 1934 г. у в. Гнеўчыцы Іванаўскага раёна Брэсцкай вобласці. З 1957 г. інструктар Іванаўскага райкама, Брэсцкага абкама, у 1959-1962 гг. - першы сакратар Кобрынскага райкама ЛКСМБ, потым інструктар Кобрынскага райкама КПБ. У 1963-1969 гг. старшыня Кобрынскага гарвыканкама. З 1969 г. па 1975 г. намеснік дырэктара Кобрынскага СПТВ № 102. Затым працаваў у сістэме будаўніцтва ў Беларусі і Расіі, удзельнічаў у асваенні Нечарназем'я РСФСР. Выбіраўся дэпутатам Брэсцкага абласнога Савета. Мае ўрадавыя ўзнагароды СССР.

**Леанюк Віктар Лук'янавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 453. - (Яны кіравалі горадам і раёнам).

### *60 гадоў з дня нараджэння С. П. Лесняка (1964)*

**Лясняк Сяргей Пятровіч** (1964-1983) - радавы, вадзіцель бронетранспарцёра. Нарадзіўся 3 лістапада 1964 г. у Кобрыне. У 1979 г. закончыў 8 класаў Кобрынскай сярэдняй школы № 6. У маі 1983 г. быў прызваны ў Савецкую армію ў Туркестанскую ваенную акругу. У кастрычніку 1983 г. быў накіраваны ў Афганістан у якасці вадзіцеля БТР. Загінуў 7 лістапада 1983 г. Узнагароджаны медалём. Пахаваны на могілках горада Кобрына.

**Лясняк Сяргей Пятровіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 446. – (Загінулі ў Афганістане).

### *60 гадоў з дня нараджэння А. А. Лукашука (1964)*

**Лукашук Аляксандр Алегавіч** - беларускі біёлаг, энтамолаг. Старшы навуковы супрацоўнік Бярэзінскага біясфернага запаведніка. Нарадзіўся 25 мая 1964 г. ў в. Шыповічы Кобрынскага раёна. У 1987 г. паступіў на працу ў Бярэзінскі біясферны запаведнік. Спецыялізацыя - энтамалогія. Аляксандр Лукашук мае вопыт палявой і лабараторнай работы ў Беларусі, краінах блізкага і далёкага замежжа ў лясных, горных абласцях. Апублікаваў 72 навуковыя працы і тры навукова-папулярныя.

**Елизарова, Ж.** Охотник за насекомыми / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2017. – 11 лістапада. – С. 3. - О белорусском энтомологе, старшем научном сотруднике национального Березинского биосферного заповедника кобринчанине Александре Лукашуке.

**Лукашук Аляксандр Алегавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 87-88. : каляр. фота.

**Лукашук Александр Олегович** [Электронный ресурс] // Государственное природоохранное учреждение «Березинский биосферный заповедник». – Режим доступа: http://www.berezinsky.by/ru/about/structure/div3/. – Дата доступа: 26.10.2017.

### *120 гадоў з дня нараджэння Е. П. Лукіной (1904)*

**Лукіна Ефрасіння Пятроўна** нарадзілася 7 ліпеня 1904 г. у Віцебску. Закончыла Мінскую вышэйшую сельскагаспадарчую школу (1936). З 1939 г. інструктар Брэсцкага абкама КП(б)Б, з 1941 г. дырэктар МТС у Саратаўскай вобл. (Расія). З 1943 г. знаходзілася ў рэзерве аператыўнай групы ЦК КП(б)Б у Маскве. У ліпені 1944 г. - кастрычніку 1946 г. - сакратар Кобрынскага райкама КП(б)Б. У 1946-1959 гг. на гаспадарчай рабоце ў Кобрыне. Выбіралася дэпутатам Кобрынскага гарадскога Савета.

**Лукіна Ефрасіння Пятроўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002.- С. 453. - (Яны кіравалі горадам і раёнам).

### *100 гадоў з дня нараджэння М. М. Любіменка (1924)*

**Любіменка Міхаіл Мікалаевіч** - Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся 29 красавіка 1924 г. у с. Новаандрэеўка Арэхаўскага раёна Запарожскай вобл. На фронце з 1942 г., ваяваў у 37-м гвардзейскім Кобрынскім стралковым палку 12-й стралковай дывізіі. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Вызначыўся 17 красавіка 1945 г. Намеснік камандзіра батальёна разам з батальёнам першы пераправіўся цераз р. Одэр, захапіў плацдарм, замацаваўся на ім, адбіў 6 контратак праціўніка, забяспечыў пераправу ўсіх падраздзяленняў палка. Званне Героя Савецкага Саюза прысвоена 31.05.1945 г. Узнагароджаны ордэнамі Леніна, Чырвонага Сцяга, двума ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, ордэнам Аляксандра Неўскага, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Любіменка Міхаіл Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 232-233. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *100 гадоў з дня нараджэння А. К. Мазурына (1924)*

**Мазурын Анатоль Кузьміч** нарадзіўся 16 студзеня 1924 г. У Вялікую Айчынную вайну на фронце. З ліпеня 1941 г. служыў старшым тэлеграфістам у 37-м гвардзейскім стралковым палку, удзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Мазурын** Анатоль Кузьміч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002.- С. 236. - (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *120 гадоў з дня нараджэння Д. К. Малькова (1904)*

**Малькоў Дзмітрый Кузьміч** - Герой Савецкага Саюза (1944), генерал-лейтэнант (1955). Нарадзіўся 8 лістапада 1904 г. у в. Лаўрухіна Савецкага раёна Кіраўскай вобласці. У Чырвонай арміі з 1927 г. Палкоўнік Д. К. Малькоў, камандзір 12-й гвардзейскай Пінскай стралковай дывізіі ўдзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Да 1960 г. служыў у Савецкай арміі.

**Малькоў** Дзмітрый Кузьміч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 233. - (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *120 гадоў з дня нараджэння А. М. Мартынава (1904)*

**Мартынаў Аляксей Міхайлавіч** (1904-1999). Нарадзіўся 20 жніўня 1904 г. у Кобрыне*.* У 1911-1915 гг. вучыўся ў Кобрынскім прыходскім вучылішчы. Пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР з 24.09.1939 г. прыцягнуты на працу ў Часовае ўпраўленне Кобрынскага павета для наладжвання работы пошты. 1 лістапада 1939 г. прызначаны загадчыкам гарадской бібліятэкі. У Вялікую Айчынную вайну быў сувязным партызанскага атрада імя Чапаева. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад акупантаў аднаўляў работу бібліятэкі. 4 жніўня 1946 г. прызначаны дырэктарам Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава. Пад яго кіраўніцтвам музей стаў адным з лепшых у Беларусі, дзе сабраны ўнікальныя калекцыі зброі, нумізматыкі. А. М. Мартынаў удзельнічаў у грамадскім жыцці Кобрыншчыны: арганізаваў раённае аддзяленне Таварыства аховы прыроды, Таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры. Вёў вялікую краязнаўчую работу. Ім напісана больш за 70 артыкулаў, якія публікаваліся ў рэспубліканскіх і мясцовых органах друку. Ганаровы грамадзянін горада Кобрына. Узнагароджаны медалём імя Н. К. Крупскай. Памёр 15 лістапада 1999 г.

**Долготович, Б. Д.** Мартынов Алексей Михайлович / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. - С. 31.

**Мартынаў Аляксей Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 437-438. – (Імі ганарацца землякі).

**Краязнавец** з Вялікай літары : біябібліяграфічны паказальнік / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук. - Кобрын, 2014. – 48 с.

**Мартынаў Аляксей Міхайлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп’ютарны дызайн вокладкі : інжынер П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С.14-23. : каляр. іл.

### *110 гадоў з дня нараджэння Ф. І. Маскаленка (1914)*

**Маскаленка Фёдар Ільыч** (1914-1960)**.** Нарадзіўся ў 1914 г. у в. Водзіна Данецкай вобласці, Украіна. У верасні 1941 г. удзельнічаў у стварэнні партызанскіх атрадаў, у т. л. атрада імя Чапаева, адным з камандзіраў якога ён быў. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені, медалямі. Пасля вайны жыў і працаваў у Кобрынскім раёне. З 1952 г. быў старшынёй калгаса «1 Мая», пазней працаваў старшынёй сельсавета.

**Маскаленка Фёдар Ільыч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 216. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

### *95 гадоў з дня нараджэння К. І. Мельнікавай (1929)*

**Мельнікава Кіра Іванаўна** нарадзілася ў 1929 г. у г. Лепель Віцебскай вобласці. У 1949 г. закончыла Брэсцкае педагагічнае вучылішча. Працавала настаўніцай у няпоўнай СШ в. Запруды, загадчыцай школы ў в. Перкі, настаўніцай пачатковых класаў у кобрынскіх сярэдніх школах № 3, № 2, № 5. Званне «Заслужаны настаўнік» прысвоена ў 1965 г.

**Мельнікава Кіра Іванаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 430. – (Вызначыліся працай).

**Мельнікава Кіра Іванаўна** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 111. : фат.

### *100 гадоў з дня нараджэння Н. І. Місюк (1924)*

**Місюк Надзея Іосіфаўна** (1924-2004)**.** Нарадзілася ў в. Брылёва. У гады Вялікай Айчыннай вайны партызанка атрада імя А. В. Суворава Пінскага злучэння. З 1944 г. па 1951 г. - сакратар Кісялевецкага сельсавета. З 1951 г. звеннявая, з 1957 г. брыгадзір паляводчай брыгады калгаса «Новы шлях» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Леніна, медалямі. Выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

**Місюк Надзея Іосіфаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002.- С. 428. – (Вызначыліся працай).

**Місюк Надзея Іосіфаўна** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 22. : фат.

### *105 гадоў з дня нараджэння С. М. Міхальчышына (1919)*

**Міхальчышын Савелій Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1919 г. ва Украіне. З 1941 г. лейтэнант С. М. Міхальчышын служыў у Брэсцкай крэпасці пры штабе, потым прызначаны камандзірам кулямётнай роты. Вайну сустрэў у Брэсцкім гарнізоне. Удзельнік вызвалення Кобрына. Пасля вайны служыў у органах унутраных спраў у Брэсце, Кобрыне. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі.

**Міхальчышын Савелій Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 237. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *100 гадоў з дня нараджэння М. А. Назарука (1924)*

**Назарук Міхаіл Аляксеевіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. Боркі Кобрынскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну спачатку быў партызанскім сувязным, з чэрвеня 1943 г. стралок партызанскага атрада імя Чкалава (са студзеня 1944 г. атрада імя Паставалава брыгады імя Чапаева). Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі. Пасля дэмабілізацыі працаваў у Астроміцкім сельсавеце, на хлебазаводзе.

**Назарук Міхаіл Аляксеевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. – С. 237. -(Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *120 гадоў з дня нараджэння М. М. Несцярука (1904)*

**Несцярук Максім Мікітавіч** (1904-1943). Нарадзіўся ў 1904 г. у в. Павіцце. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўключыўся ў падпольную барацьбу. З 1942 г. да 1943 г. быў сувязным партызанскіх атрадаў імя Шчорса і імя Катоўскага. Загінуў у кастрычніку 1943 г.

**Несцярук Максім Мікітавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002.- С. 223. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *65 гадоў з дня нараджэння М. А. Новіка (1959)*

**Новік Мікалай Аляксеевіч** нарадзіўся 22 красавіка 1959 г. у в. Астромічы Кобрынскага раёна. Член Саюза дызайнераў Беларусі (1991). Займаецца дызайнам асяроддзя, абсталявання, графічным дызайнам. Сярод асноўных работ - праекты школы мастацтваў саўгаса «Днепра-Бугскі» Кобрынскага раёна, абсталявання для вучэбнай майстэрні малюнка і жывапісу, дзіцячага паркавага атракцыёну. Працы М. А. Новіка знаходзяцца ў прыватных мастацкіх калекцыях у Англіі, Германіі, Канадзе, Польшчы, ЗША, Францыі і іншых краінах.

**Новік Мікалай Аляксеевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 439-440. – (Імі ганарацца землякі).

## *160 гадоў з дня нараджэння М. Радзевіч (1864-1944)*

**Марыя Радзевіч** - польская пісьменніца, аўтар больш за 40 аповесцей і навел, прысвечаных жыццю палескай шляхты і сялянства, прыродзе і побыту простых людзей, а таксама настальгічнаму патрыятызму, ідэалізацыі патрыярхальнага мінулага. Нарадзілася 2 лютага 1864 г. Большую частку жыцця (з 1881 па 1939) правяла ў маёнтку Грушава (Кобрынскі павет), дзе пісала свае творы, якія друкаваліся ў Варшаве.

**Марыя Радзевіч** // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. - Мінск, 1986. - Т.4. - С. 449.

**Радзевіч Марыя** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 65. – (Лёсам звязаны з Кобрыншчынай).

## *105 гадоў з дня нараджэння І. Ц. Разумоўскага (1919)*

**Разумоўскі Іван Ціханавіч** нарадзіўся 23 студзеня 1919 г. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны паступіў у ваеннае вучылішча ў Маскве. Вайну пачаў 22 чэрвеня 1941 г. у складзе курсанцкай роты вучылішча. Служыў у 533-м армейскім Кобрынскім знішчальным процітанкавым артылерыйскім палку, удзельнічаў у вызваленні Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Вайну закончыў у маі 1945 г. камандзірам знішчальнай процітанкавай батарэі ў званні капітана. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I і II ступеней, медалямі.

**Разумоўскі Іван Ціханавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка.- Мінск, 2002.- С. 237. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## *100 гадоў з дня нараджэння М. А. Салея (1924)*

**Салей Мікалай Андрэевіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. Балоты. Закончыў Ленінградскае ваенна-палітычнае вучылішча (1952) і гістарычны факультэт Гомельскага педінстытута (1954). У маі 1943 г. стаў падрыўніком партызанскага атрада імя Катоўскага. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх прызваны ў Чырвоную армію, потым накіраваны на працу ў органы НКУС. У 1959-1976 гг. працаваў дырэктарам школы ў в. Кісялёўцы Кобрынскага раёна. Узнагароджаны медалямі.

**Салей Мікалай Андрэевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 225. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## *40 гадоў з дня нараджэння М. Серадовіча (1984)*

**Серадовіч Мікалай** - спартсмен. Нарадзіўся ў 1984 г. Майстар спорту Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы, прызёр юніёрскіх чэмпіянатаў свету ў 2001 г. (Германія), 2002 г. (Ямайка).

**Серадовіч Мікалай** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 441. - (Імі ганарацца землякі).

## *60 гадоў з дня нараджэння І. Ф. Сідарука (1964)*

**Сідарук Ігар Фёдаравіч** нарадзіўся ў Кобрыне 23 ліпеня 1964 г. ў сям'і служачых. Тут закончыў школу, пазней - філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта імя У. І. Леніна. З 1993 г. загадчык літаратурна-драматычнай часткі ў Брэсцкім абласным тэатры лялек. Ігар Сідарук выступае ў драматургіі і паэзіі, піша для дзяцей. Ён - аўтар п'ес, пастаўленых у розных тэатрах Беларусі.

**Ігар Сідарук** // Літаратурная карта Берасцейшчыны. – Брэст, 2008. – С. 315-316.

**Сідарук Ігар Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 441. – (Імі ганарацца землякі).

**Ігар Сідарук**. «Іншым разам радок дыктуе само неба…» : біябібліяграфічны паказальнік / Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; складальнік С. Д. Курачук. – Кобрын, 2014. - 28 с.

### *115 гадоў з дня нараджэння П. С. Сідарук (1909)*

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** (1909-2001)**.** Нарадзілася ў 1909 г. у в. Ілаўск у сялянскай сям'і. У кастрычніку 1939 г. была выбрана дэпутатам Народнага сходу Заходняй Беларусі. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны апынулася ў Паволжжы, пазней была закінута ў Кобрынскі раён для арганізацыі падпольнай і партызанскай барацьбы. Была членам бюро Антопальскага падпольнага райкама КП(б)Б, які знаходзіўся ў партызанскім атрадзе імя Кірава. Пасля вайны працавала сакратаром Кобрынскага райкама партыі, пазней намеснікам старшыні Кобрынскага райвыканкама. Ганаровая грамадзянка горада Кобрына.

**Долготович, Б. Д.** Сидорук Прасковья Семёновна / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32.

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 455. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Сідарук Праскоўя Сямёнаўна** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі : інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 27-28. : каляр. іл.

### *115 гадоў з дня нараджэння Ф. Н. Сідзюка (1909)*

**Сідзюк Фама Нíканавіч** (1909-1991). Нарадзіўся ў 1909 г. у в. Турная. З 1934 г. сакратар ячэйкі КПЗБ у роднай вёсцы, з 1935 г. падраённы сакратар КПЗБ Турнянскага ўчастка. Пасля ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР працаваў у Кобрынскім гархарчгандлі. З 1941 г. у Чырвонай арміі, быў накіраваны ў Тамбоў (Расія), да 1945 г. служыў у савецкім тыле. Пасля Вялікай Айчыннай вайны жыў і працаваў у Кобрыне.

**Сідзюк Фама Ніканавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 115. – (Удзельнікі рэвалюцыйных выступленняў на Кобрыншчыне (1921-1939).

### *75 гадоў з дня нараджэння І. В. Соўпеля (1949)*

**Соўпель Ігар Васільевіч** - беларускі вучоны, спецыяліст у галіне інфарматыкі. Доктар тэхнічных навук (1991), прафесар (1994). Нарадзіўся 8 красавіка 1949 г. у в. Гарадзец Кобрынскага раёна. Закончыў матэматычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1971). Працаваў у Інстытуце матэматыкі АН БССР. З 1981 г. - дацэнт, з 1997 г. Ігар Васільевіч загадчык кафедры матэматычнага забеспячэння АСК факультэта прыкладной матэматыкі БДУ. І. В. Соўпель з'яўляецца навуковым кіраўніком лабараторыі інтэлектуальных інфармацыйных сістэм. Аўтар шэрагу вынаходніцтваў у галіне штучнага інтэлекту, якія запатэнтаваны ў міжнародных патэнтных фондах. Член Навукова-метадычнага савета Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. У 1999 г. узнагароджаны нагрудным знакам «Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь».

**Соўпель Ігар Васільевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 15. – С. 91.

**Совпель Игорь Васильевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 2. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 279.

**Совпель Игорь Васильевич** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 7. - С. 16 – 17.

**Соўпель Ігар Васільевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 134-135.

### *90 гадоў з дня нараджэння А. З. Старыкавай (1934)*

**Старыкава Анастасія Зоцікаўна** нарадзілася ў 1934 г. у в. Лелікава. З 1949 г. працавала ў калгасах «Чырвоная Зорка» Кобрынскага раёна, імя Лесі Украінкі Валынскай вобласці (Украіна), саўгасах «Нежынскі» Какчатаўскай вобласці (Казахстан) і «Патрыкі» Кобрынскага раёна. Узнагароджана ордэнам Леніна (1971).

**Старыкава Анастасія Зоцікаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 428. – (Вызначыліся працай).

**Старыкава Анастасія Зоцікаўна** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 24. : фат.

### *85 гадоў з дня нараджэння А. С. Стоцкага (1939)*

**Стоцкі Аляксей Сямёнавіч** нарадзіўся ў 1939 г. у в. Стрыгава. Пасля службы ў радах Савецкай арміі стаў працаваць трактарыстам у калгасе імя Дзімітрава Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнамі Леніна і Працоўнага Чырвонага Сцяга.

**Стоцкі Аляксей Сямёна**віч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002.- С. 428. - (Вызначыліся працай).

**Стоцкі Аляксей Сямёнавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 24. : фат.

### *105 гадоў з дня нараджэння В. В. Сцёпкіна (1919)*

**Сцёпкін Валянцін Васільевіч** нарадзіўся ў 1919 г. у Кобрынскім раёне. З верасня 1943 г. баец партызанскага атрада імя Чапаева. З лістапада 1943 г. палітрук роты, са студзеня 1944 г. камісар атрада імя Малянкова, з мая 1944 г. начальнік штаба партызанскай брыгады імя Чапаева. Пасля вызвалення Кобрынскага раёна накіраваны на савецкую работу ў Косаўскі раён Брэсцкай вобласці. Узнагароджаны медалямі.

**Сцёпкін Валянцін Васільевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. -С. 217. – (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

### *95 гадоў з дня нараджэння М. М. Суботы (1929)*

**Субота Міхаіл Максімавіч** нарадзіўся ў 1929 г. у в. Лозкі Пружанскага раёна. Пасля службы ў радах Савецкай арміі і заканчэння Пінскага вучылішча механізацыі працаваў камбайнёрам у Яроміцкай МТС, з 1958 г. - трактарыстам у калгасе імя Мічурына Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1971), медалём.

**Субота Міхаіл Максімавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 428. - (Вызначыліся працай).

**Субота Міхаіл Максімавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 24. : фат.

### *85 гадоў з дня нараджэння П. Д. Сялюка (1939)*

**Сялюк Пётр Дзянісавіч** (1939-2010). Нарадзіўся 12 ліпеня 1939 г. у в. Філіповічы Капаткевіцкага раёна Гомельскай вобласці ў сялянскай сям'і. З верасня 1959 г. і да апошняга дня Пётр Дзянісавіч працаваў на Кобрынскім рамонтным заводзе. За высокія паказчыкі ў працы Пётр Дзянісавіч Сялюк удастоены ордэнамі «Знак Пашаны» (1977),

Працоўнай Славы II (1986) і III (1975) ступеняў, медалём «За доблесную працу» (1970), «Ветэран працы»(1984). Пётр Дзянісавіч актыўна ўдзельнічаў у жыцці завода, быў членам бюро гарадскога камітэта КПБ і партбюро завода, дэлегатам XXVIII з'езда КПБ і XXVI з'езда КПСС. У 1971 г. яму было прысвоена званне «Ударнік камуністычнай працы». Узнагароджаны нагрудным знакам «Настаўнік моладзі» (1976). У 1978 г. прысвоена ганаровае званне «Заслужаны настаўнік працоўнай моладзі Беларускай ССР». Удзельнік выстаў ВДНГ СССР (1971) і ВДНГ БССР (1979). У год святкавання 700-годдзя Кобрына прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін горада Кобрына». Памёр П. Д. Сялюк 28 снежня 2010 г.

**Долготович, Б. Д.** Селюк Петр Денисович / Б. Д. Долготович // Почетные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32.

**Сялюк Пётр Дзянісавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі : інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 29-30. : каляр. іл.

**Сялюк Пётр Дзянісавіч** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 76, 115. : фат.

## *100 гадоў з дня нараджэння Я. І. Тураўца (1924)*

**Туравец Якаў Іванавіч** нарадзіўся 7 лістапада 1924 г. у г. Петрыкаў Гомельскай вобласці. У пачатку 1940 г. разам з сям'ёй прыехаў у Брэст для аднаўлення Дняпроўска-Бугскага канала. З 1943 г. - партызан, разведчык атрада імя Катоўскага Брэсцкага партызанскага злучэння. З красавіка 1944 г. у Чырвонай арміі. Узнагароджаны медалямі. Пасля вайны закончыў ваеннае вучылішча, пазней ваенную акадэмію, інжынер-палкоўнік, выкладчык ВНУ.

**Туравец Якаў Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002.- С. 226. – (Змагаліся ў тыле ворага).

## *100 гадоў з дня нараджэння П. П. Фацеева (1924)*

**Фацееў Пётр Піліпавіч** нарадзіўся ў 1924 г. у Маскве. З верасня 1943 г. разведчык партызанскага атрада імя Катоўскага, прымаў і апрацоўваў зводкі Саўінфармбюро. З мая 1944 г. да кастрычніка 1946 г. служыў у Чырвонай арміі. Пасля дэмабілізацыі закончыў Маскоўскі энергетычны інстытут, працаваў загадчыкам аддзела вымярэнняў і вымяральнай тэхнікі пры інстытуце. Узнагароджаны медалямі.

**Фацееў Пётр Піліпавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 226. - (Змагаліся ў тыле ворага).

## *120 гадоў з дня нараджэння А. І. Федасюк (1904)*

**Федасюк Аляксандра Іванаўна** (1904-1995) - дзяржаўны дзеяч. Нарадзілася 17 жніўня 1904 г. у в. Андронава*.* З 1926 г. член Кобрынскага падпольнага райкама, з 1928 г. член Брэсцкага падпольнага акруговага камітэта КПЗБ. У кастрычніку 1931 г. - сакавіку 1932 г. сакратар Навагрудскага акруговага камітэта КПЗБ. У 1929-1937 гг. сакратар ЦК КСМЗБ. З мая 1934 г. навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі партыі і Кастрычніцкай рэвалюцыі пры ЦК КП(б)Б. Пасля вызвалення Заходняй Беларусі ў верасні 1939 г. дэпутат Народнага сходу Заходняй Беларусі, член яго паўнамоцнай камісіі на сесіі Вярхоўнага Савета СССР. Са студзеня 1940 г. на савецкай рабоце. У Вялікую Айчынную вайну ў партызанах - сакратар Дзівінскага падпольнага райкама, член бюро Брэсцкага

падпольнага абкама КП(б)Б. У 1944-1957 гг. сакратар Брэсцкага, Маладзечанскага гаркамаў КПБ, загадчык аддзела ЦК КПБ. Дэлегат I (1928), II (1935) з'ездаў КПЗБ, кангрэса КІМа (1933). Узнагароджана ордэнамі Леніна і Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Федосюк Александра Ивановна** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 2. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 433.

**Федасюк Аляксандра Іванаўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 443-444. – (Імі ганарацца землякі).

**Федасюк Аляксандра Іванаўна** // Па працы і пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 25-26. : фат.

### *40 гадоў з дня нараджэння М. А. Ціханавай (1984)*

**Ціханава Марына Аркадзьеўна** - спартсменка. Нарадзілася ў 1984 г. Майстар спорту Рэспублікі Беларусь па лёгкай атлетыцы. Прызёр чэмпіянатаў свету сярод юніёраў у 1999 г. (Польшча) і ў 2002 г. (Ямайка).

**Ціханова Марына Аркадзьеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 444. - (Імі ганарацца землякі).

### *105 гадоў з дня нараджэння С. І. Шпілеўскага (1919)*

**Шпілеўскі Сігізмунд Іванавіч** нарадзіўся ў 1919 г. у г. Кобрыне. У 1948 г. у Кобрынскай санітарна-эпідэміялагічнай станцыі пачаў ствараецца супрацьэпідэмічны аддзел, першым яго кіраўніком стаў памочнік эпідэміёлага Сігізмунд Іванавіч. У далейшым у час адсутнасці галоўнага ўрача выконваючым яго абавязкі прызначаецца Шпілеўскі. У 1974 г. С. І. Шпілеўскаму прысвоена званне «Заслужаны работнік аховы здароўя Беларускай ССР».

**Заслужаны** работнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь. 1977. С. І. Шпілеўскі // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1998. – Т. 6. – С. 561, 562.

**Шпілеўскі Сігізмунд Іванавіч** // Памяць : гісторыка-дакументальная хроніка Кобрынскага раёна. – Мінск, 2002. - С. 301. – (Яны прайшлі дарогамі вайны).

**Шпілеўскі Сігізмунд Іванавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 119. : фат.

### *90 гадоў з дня нараджэння А. І. Шымко (1934)*

**Шымко Аляксей Іванавіч** нарадзіўся ў 1934 г. у г. Кобрыне. Закончыў факультэт станкавага жывапісу завочнага народнага ўніверсітэта мастацтваў імя Крупскай (1959), мастацкі інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя Рэпіна, факультэт ТГВМ (1964). Алейны жывапіс і акварэль у стылі наіўнага рэалізму.

**Шымко Аляксей Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 526. – (Кобрынскія мастакі на мяжы стагоддзяў).

### *65 гадоў з дня нараджэння У. М. Чыквіна (1959)*

**Чыквін Уладзімір Мікалаевіч** нарадзіўся ў 1959 г. у г. Высокае Камянецкага раёна. Закончыў мастацкі факультэт Віцебскага педагагічнага інстытута (1985). Працаваў выкладчыкам і майстрам разьбы па дрэву ў ПТВ-105 народных мастацкіх промыслаў, выкладчыкам на мастацкам факультэце Брэсцкага педагагічнага ўніверсітэта. Алейны жывапіс і графіка ў рэалістычным стылі ў традыцыі віцебскай мастацкай школы. У скульптуры развівае формаўтваральныя традыцыі 20-х гадоў XX ст. З 2004 г. з'яўляецца

членам Беларускага Саюза майстроў народнай творчасці, у 2005 г. выбраны старшынёй Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза майстроў.

**Чыквін Уладзімір Мікалаевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 526. - (Кобрынскія мастакі на мяжы стагоддзяў).

### *100 гадоў з дня нараджэння Ф. Ф. Швайко (1924)*

**Швайко Фёдар Фёдаравіч** нарадзіўся ў 1924 г. у в. Стрыі. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ў семнаццацігадовым узросце стаў сувязным партызанскіх груп. З сакавіка 1943 г. у атрадзе імя Чапаева, са студзеня 1944 г. у брыгадзе імя Чапаева: спачатку радавы, потым камандзір аддзялення ўзвода, камандзір роты. Удзельнік вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў. У ліпені 1944 г. накіраваны на працу ў аддзел міліцыі Кобрына. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Швайко Фёдар Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002.- С. 227. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *110 гадоў з дня нараджэння А. К. Шварцкопфа (1914)*

**Шварцкопф Аляксей Карлавіч** нарадзіўся ў 1914 г. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны на фронце. Даслужыўся да камандзіра 2-й батарэі 533-га армейскага знішчальнага процітанкавага артылерыйскага палка. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Шварцкопф Аляксей Карлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 239. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

# Юбілейныя даты рэлігійных устаноў

### *Царкве ў імя святога архангела Міхаіла ў в. Бародзічы (1999) – 25 гадоў*

**Царква ў імя святога архангела Міхаіла** ў в. Бародзічы пабудавана з дрэва ў 1999 г. на месцы папярэдняга драўлянага храма XIX ст.

**Царква** ў імя святога архангела Міхаіла // Захавальнікі гісторыі роднага краю : турыстычна-бібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2016. – С. 44. : каляр. фота.

### *Свята-Крыжаўзвіжанскай царкве ў в. Бяроза (1864) - 160 гадоў*

**Свята-Крыжаўзвіжанская царква** знаходзілася на паўднёвай ускраіне вёскі Бяроза на вуліцы Савецкай. Пабудавана ў 1864-1867 гг. на месцы праваслаўнага храма, які згарэў. Помнік мае рысы стылю класіцызму. Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Бярозаўская** Крыжаўзвіжанская царква // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. – Т. 2. – С. 163.

**Свята-Крыжаўзвіжанская** царква ў в. Бяроза // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 465, 466. – (Драўлянае царкоўнае дойлідства).

### *Свята-Успенскай царкве ў в. Тэўлі (1874) - 150 гадоў*

**Свята-Успенская царква** – помнік архітэктуры сінадальнага накірунку рэтраспектыўна-рускага стылю. Пабудавана ў 1874 г. у в. Тэўлі з цэглы паводле праекта архітэктара Міхалоўскага. Царква дзейнічае, уключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Свята-Успенская** царква ў в. Тэўлі // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 462. – (Праваслаўнае мураванае дойлідства).

### *Свята-Пакроўскай царкве ў в. Хабовічы (1899) - 125 гадоў*

**Свята-Пакроўская царква** размешчана ў цэнтры в. Хабовічы. Пабудавана ў 1899 г. на ўрадавыя сродкі на месцы ранейшага храма. Царква ўключана ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

**Свята-Пакроўская** царква ў в. Хабовічы // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 466, 467. – (Драўлянае царкоўнае дойлідства).

# Юбілейныя даты прадпрыемстваў і ўстаноў горада і раёна

### *Пракуратуры Кобрынскага раёна (1939) - 85 гадоў*

**Пракуратура** Кобрыншчыны бярэ пачатак з верасня 1939 г. Пасля вызвалення Кобрынскага раёна ў ліпені 1944 г. пракурорам раёна быў прызначаны юрыст I класа А. В. Лукоўкін. У тыя гады ў штаце пракуратуры практычна не было супрацоўнікаў з вышэйшай адукацыяй, на працу прыходзілі былыя франтавікі, якія скончылі трохмесячныя юрыдычныя курсы і працягвалі завочнае навучанне. Уклад ва ўмацаванне законнасці ў раёне ўнеслі пракурорскія работнікі Кобрыншчыны Якіменкаў В. І., Міжэўскі І. С., Маеўскі І. А., Капітан В. С., Пархачук А. А., Амельянюк В. В., Сцепанюк Е. М., Запарошчанка М. І., Петрасюк А. І. і іншыя. Пракуратура Кобрынскага раёна забяспечвае нагляд за законнасцю дзеянняў следчага апарата, работы міліцыі, абгрунтаванасці рашэнняў суда.

**Елизарова, Ж.** На страже законности / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. - 2020. — 24 чэрвеня (№ 48). — С. 3 : фот. - О работе прокуратуры Кобринского района.

**Петросюк, А**. «Справедливость в правосудии должна стоять на первом месте» : к 95-летию органов прокуратуры Беларуси / Александр Петросюк // Кобрин-информ. - 2017. - 22 июня. - С. 6.

**Пракуратура** пераехала // Народная трыбуна. – 2009. – 12 верасня. – С. 3. - 7 верасня пракуратура раёна справіла наваселле ў будынку былой шахматнай школы па вуліцы Савецкай.

### *Аддзелу ўнутраных спраў Кобрынскага райвыканкама (1939) – 85 гадоў*

Міліцыя Брэстчыны, у тым ліку Кобрыншчыны, бярэ пачатак з верасня 1939 г. пасля ўз'яднання заходніх абласцей Беларусі з Беларускай ССР. 2 лістапада 1939 г. загадам народнага камісарыята ўнутраных спраў СССР у ліку іншых створаны Кобрынскі павятовы аддзел міліцыі. Яго першым начальнікам быў прызначаны Міхаіл Ісмакаў. Слаўны і гераічны шлях прайшла кобрынская міліцыя. Актыўны ўдзел у барацьбе з бандытызмам, злачыннасцю прымалі першыя ўчастковыя інспектары А. І. Ратайка, К. П. Тур, М. І. Барздун. Гераічны шлях у гады Вялікай Айчыннай вайны прайшоў участковы М. М.

Шаўчук, які за мужнасць і гераізм быў узнагароджаны 12 ордэнамі і медалямі. У 90-я гады XX ст. сярод лепшых супрацоўнікаў Кобрынскага ГРАУС : оперупаўнаважаныя аддзела крымінальнага вышуку Ю. П. Дзядзюк, П. М. Магуйла, нам. начальніка АБЭЗ Г. П. Технолчын, оперупаўнаважаныя АБЭЗ А. У. Макарук, В. В. Вішнеўскі, участковыя інспектары С. В. Цімашчук, А. А. Кананчук, М. Ф. Ігнацюк і інш. У лістападзе 2009 г. Кобрынскі раённы аддзел унутраных спраў адзначыў сваё 70-годдзе, у гэты ж дзень адбылося адкрыццё новага будынка РАУС.

**Белов, Д.** На страже законности и правопорядка / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. — 2 лістапада. — С. 1, 3 : фот. - Кобринскому РОВД — 80 лет.

**Степанюк, В.** Путь длиною в сотню лет / Владимир Степанюк // Кобрин-информ. - 2017. - 2 марта. - С. 4. - История образования Кобринского районного отдела внутренних дел.

**Белов, Д.** На страже законности и правопорядка / Дмитрий Белов // Кобрынскі веснік. - 2019. — 2 лістапада. — С. 1, 3 : фот. - Кобринскому РОВД — 80 лет.

**Суббота, М. А.** Кобринскому РОВД – 75 лет. Из истории становления Кобринского РОВД / М. А. Суббота // Кобрин-информ. – 2014. – 30 октября. – С. 4-5.

## *Кобрынскаму раённаму ваеннаму камісарыяту (1944) - 80 гадоў*

Гісторыя **Кобрынскага раённага ваеннага камісарыяту** пачынаецца з 18 ліпеня 1944 г. На аснове загаду Камандуючага Беларускай ваеннай акругай № 0347 і дырэктывы Брэсцкага абласнога ваеннага камісарыята быў сфарміраваны Кобрынскі раённы ваенны камісарыят. У сувязі з пераходам на новы штат у красавіку 1963 г. перайменаваны ў Кобрынскі аб’яднаны гарадскі ваенны камісарыят, які ў той час быў у складзе Беларускай ваеннай акругі, у 1992 г. увайшоў у склад Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь. У працэсе рэфарміравання Узброеных Сіл 1 верасня 2002 г. Кобрынскі аб'яднаны гарадскі ваенны камісарыят быў пераведзены на новы штат і зноў перайменаваны ў Кобрынскі раённы ваенны камісарыят. Асноўныя крытэрыі работы Кобрынскага ваеннага камісарыята - гатоўнасць да правядзення мабілізацыі людскіх і транспартных рэсурсаў на тэрыторыі раёна ў мірны і ваенны час, а таксама стан улікова-прызыўнай працы ў ваенкамаце, якаснае правядзення мерапрыемстваў па тэрытарыяльнай абароне.

**Вовк, Ю.** Военкомат: история, современность, успехи / Юлия Вовк // Кобрин-информ. - 2018. — 10 мая. — С. 3.

**Круглов, И.** Кобринский РВК – лучший в области / [Игорь Круглов ; беседовала] Наталья Кондрашук // Кобрин-информ. - 2014. - 17 июля. - С. 3. - Военный комиссар полковник И. Круглов – о деятельности местного органа военного управления.

**Круглов, И. В.** И снова призыв / И. В. Круглов, [беседовала Маргарита Савчук] // Кобрин-информ. – 2012. – 29 марта. - Кобринский комиссариат возглавил подполковник И. В. Круглов.

## *Адкрытаму акцыянернаму таварыству «Кобрынскі масларобча-сыраробчы завод» (1939) - 85 гадоў*

**Кобрынскі масласыраробчы завод** заснаваны ў 1939 г. як маслазавод. Пасля Вялікай Айчыннай вайны рэканструяваны. У 1967 г. пабудаваны новы завод, магутнасць якога была разлічана на перапрацоўку 50 т малака за змену. У 1989 г. уступіў у строй цэх сухога абястлушчанага малака. У 1997 г. завод набыў статус адкрытага акцыянернага таварыства. Пастаўшчыкамі з’яўляюцца гаспадаркі і прыватны сектар Кобрынскага раёна. Сёння завод, які вядзе адлік сваёй гісторыі з 1939 г., - сучаснае высокатэхналагічнае прадпрыемства. Пакупнікі любяць прадукцыю завода за тое, што яна натуральная і ўтрымлівае мінімум розных стабілізатараў і дабавак. Кобрынския сыры з'яўляюцца асновай асартыменту і своеасаблівай візітнай карткай ААТ «Кобрынскі МСЗ». Акрамя сыру выпускаецца каля 130 найменняў натуральнай малочнай прадукцыі. Ёсць у

кобрынскага прадпрыемства перамогі на рэспубліканскіх конкурсах, ганаровы дыплом «Лепшая кампанія СНД», дыпломы «Лепшы прадукт года», за перамогу ў конкурсах «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь» і «Лепшыя тавары Рэспублікі Беларусь на рынку Расійскай Федэрацыі» і г. д.

**Адкрытае** акцыянернае таварыства «Кобрынскі масласыраробчы завод» // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 412-413.

**Всегда** только лучшее! // Брестчина, устремлённая в будущее. – Брест, 2009. – С. 274-275. - ОАО «Кобринский маслодельно-сыродельный завод».

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** - беларускі мастак, ювелір. Нарадзіўся 28 лістапада 1950 г. у в. Патрыкі. Закончыў Мінскае мастацкае вучылішча імя А. К. Глебава (1982). З 1983 г. удзельнік абласных, рэспубліканскіх, усесаюзных і замежных выстаў, міжнародных сімпозіумаў па эмалі ў Іспаніі, Латвіі і Літве. У 1993-1997 гг. узнаўляў страчаны ў час Вялікай Айчыннай вайны Крыж Ефрасінні Полацкай, аднавіў тэхніку перагародчатай эмалі XII ст. Сумесна з дактарамі Расійскай акадэміі навук А. Аляксеевым і Т. Макаравай выдаў кнігу «Крыж - прыгажосць царквы». Член Беларускага саюза мастакоў з 1987 года. Працаваў мастаком на Брэсцкім камбінаце «Мастацтва», з 1998 г. - мастак у Мінскай епархіі. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі 1998 г. Узнагароджаны ордэнам Крыжа прападобнай Еўфрасінні, ігуменні Полацкай (2002). Заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі (2007).

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999.- Т. 8. - С. 565.

**Кузьмич Николай Петрович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т.1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 514.

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. – Мінск, 2013. - Т. 4. – С. 618.

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Мастакі Брэстчыны / складальнік П. А. Рабаў. - С. 48—49. - Брэст, 2019

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 436. – (Імі ганарацца землякі).

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Сучаснае беларускае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва XXI стагоддзе= Современное белорусское декоративно-прикладное искусство XXI век=Modern Belarustar ats and crats XXI century : альбом. - Мінск, 2013. - С. 104-105.

**Мікалай Кузьміч** // Мастакі Брэстчыны. - Брэст, 2010.- С. 70.

**Николай Кузьмич** // Художники Брестчины : альбом-каталог на русском и английском языках. – Брест, 1997. - С. 50.

**Художник** Н. П. Кузьмич, воссоздавший Крест Евфросинии Полоцкой // Современная Беларусь : энциклопедический справочник : в 3 т. - Минск, 2007. - Т. 3. Культура и искусство. – С. 342 : фото.

**Кузьміч Мікалай Пятровіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 92-96. : фат.

**Мікалай Пятровіч Кузьміч**: чалавек стагоддзя : біябібліяграфічны паказальнік / Абласная бібліятэка імя М. Горкага; склад. Т. С. Філіпава, В. А. Гарбачэўская. - Брэст: Паліграфія, 2011.- 52 с.

**Лосич, П.** Мастеру — почет / Павел Лосич // Советская Белоруссия. - 2019. — 27 августа. — С. 7. - Художник-эмальер Н. Кузьмич стал почетным гражданином г. Бреста.

**Хокимова, А.** Николай Кузьмич — Почетный гражданин города Бреста / Антонина Хокимова // Вечерний Брест. - 2019. — 23 августа. — С. 3.

## *100 гадоў з дня нараджэння Я. Р. Кузьміча (1925)*

**Кузьміч Якаў Раманавіч.** Нарадзіўся ў 1925 г. у в. Забужкі. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля дэмабілізацыі працаваў у калгасе «Савецкая Беларусь» Кобрынскага раёна, з 1957 г. у Яроміцкім будаўніча-мантажным упраўленні. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1966), медалямі, Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

**Кузьміч Якаў Раманавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 427-428. - (Вызначыліся працай).

### *105 гадоў з дня нараджэння Л. К. Кустова (1920)*

**Кустоў Леў Канстанцінавіч.** Нарадзіўся ў 1920 г. У Вялікую Айчынную вайну ў 1941-1945 гг. удзельнічаў ва ўсіх аперацыях 60-га гвардзейскага Кобрынскага корпуснога артылерыйскага палка. Займаў пасады камандзіра батарэі, начальніка штаба артдывізіёна і першага памочніка начальніка штаба палка. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I і II ступеней, трыма ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Кустоў Леў Канстанцінавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002.- С. 235. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *95 гадоў з дня нараджэння Л. М. Лаганчука (1930)*

**Лаганчук Леанід Міхайлавіч**. Кандыдат тэхнічных навук, дацэнт. Нарадзіўся 25 красавіка 1930 г. У 1948 годзе Леанід Лаганчук скончыў сярэднюю школу № 1 г. Кобрына.

**Лаганчук Леанід Міхайлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 85.

### *85 гадоў з дня нараджэння С. Ф. Любчука (1940)*

**Любчук Сяргей Фядосавіч.** Беларускі дзеяч самадзейнага мастацтва, кампазітар, заслужаны работнік культуры Беларусі (1978). Нарадзіўся 2 мая 1940 г. у в. Дзівін Кобрынскага раёна. Скончыў Беларускую кансерваторыю (1965). З 1960 г. выкладчык, кіраўнік аркестра сярэдняй школы № 34, саліст-баяніст Беларускага тэлебачання і радыё ў Мінску. З 1965 г. у Брэсце: кіраўнік аркестра народных інструментаў і выкладчык музычнага вучылішча, кіраўнік народнага ансамбля песні і танца «Брастчанка» электрамеханічнага завода, з 1980 г. мастацкі кіраўнік народнага ансамбля песні і танца «Бярэсце» Палаца культуры аблсаўпрофа. Аўтар фантазіі на тэмы беларускіх народных песень для баяна з аркестрам народных інструментаў, рамансаў, песень, музыкі да спектакляў абласнога тэатра лялек, апрацовак і пералажэнняў для аркестра народных інструментаў і народных хароў.

**Любчук Сергей Федосович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [В 7 т.]. - Минск, 2006. - Т. 4.- С. 594.

**Любчук Сяргей Фядосавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 1999. – Т. 9. – С. 400.

**Любчук Сергей Федосьевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2-х кн. – Минск, 2009. – Кн. 2. – С. 52.

**Любчук Сяргей Фядосавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 122-123. : фат.

### *100 гадоў з дня нараджэння А. А. Ляскова (1925)*

**Ляскоў Афанасій Ануфрыевіч.** Нарадзіўся у 1925 г. у мястэчку Стара-Свянцяны, Літва. З 1927 г. жыў у Кобрыне. У 1944 г. добраахвотна пайшоў на фронт, быў накіраваны ў 9 паветрана-дэсантную дывізію. Удзельнік вызвалення Кобрына. У 1945 г. памочнік камандзіра ўзвода 175-га палка. У 1945 г. удастоены амерыканскага ордэна «Легіён за заслугі». Дэмабілізаваны ў 1958 г. Узнагароджаны ордэнамі Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны I ступені, Славы II і III ступеней, Чырвонай Зоркі, медалямі. З 1985 г. жыў у Брэсце.

**Ляскоў Афанасій Ануфрыевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 236 : фота. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

## *80 гадоў з дня нараджэння М. М. Макарука (1945)*

**Макарук Міхаіл Маркавіч**. Кандыдат ваенных навук, генерал-лейтэнант (2000). Нарадзіўся Міхаіл Макарук 1 жніўня 1945 г. у в. Мацы Кобрынскага раёна. З 1991 г. ён памочнік галоўнакамандуючага ВПС, намеснік начальніка ўпраўлення ВПС Галоўнага аператыўнага ўпраўлення Генеральнага штаба Узброеных сіл Расійскай Федэрацыі. Ваенны, ваенна-паветраны і ваенна-марскі аташэ пры пасольстве Расійскай Федэрацыі ў Іспаніі (1997-2000), з 2001 г. - у Рэспубліцы Куба. 1 жніўня 2005 г. Міхаіл Маркавіч сышоў у запас у сувязі з пенсійным узростам.

**Макарук Міхаіл Маркавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 437. – (Імі ганарацца землякі).

**Макарук Міхаіл Маркавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 89-90.

**Гурда, В.** Орел крылатого племени Брестчины / Владимир Гурда // Кобрин-информ. – 2006. – 12 января.

## *80 гадоў з дня нараджэння І. П. Мароза (1945)*

**Мароз Іван Паўлавіч.** Нарадзіўся 22 сакавіка 1945 г. у в. Свішчы Жабінкаўскага раёна Брэсцкай вобласці. Сваю працоўную дзейнасць пачаў у 1966 г. майстрам Кобрынскага рамонтнага завода. З 1969 г. па 1986 г. працаваў на пасадзе начальніка вытворча-дыспетчарскага аддзела Кобрынскага рамонтнага завода. У 1986 г. Іван Мароз прызначаны кіраўніком Кобрынскай сельгастэхнікі. Пасля перайменавання ў адкрытае акцыянернае таварыства «Кобрынаграмаш» з 2003 г. па жнівень 2014 г. працаваў дырэктарам прадпрыемства. Без малога 30 гадоў ён кіраваў прадпрыемствам з колькасцю работнікаў каля 750 чалавек. У 1987 г. Іван Паўлавіч узнагароджаны медалём «За працоўную доблесць», у 1989 г. - медалём «Ветэран працы», у 1999 г. - ордэнам Пашаны, у 2004 г. - ордэнам Айчыны III ступені, граматамі Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта і Кобрынскага раённага выканаўчага камітэта. Рашэннем Кобрынскага раённага Савета дэпутатаў ад 13 студзеня 2015 г. № 37 за асабісты ўклад у развіццё эканомікі раёна Марозу Івану Паўлавічу прысвоена званне «Ганаровы грамадзянін Кобрынскага раёна».

**Мароз Іван Паўлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп’ютарны дызайн вокладкі : інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 45-47. : каляр. іл.

**Мароз Іван Паўлавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 62-63. : фат.

**Кузина, С.** Навечно сохраним / Светлана Кузина // Кобрынскі веснік. - 2018. - 6 кастрычніка. - С. 4. - Почетный гражданин Кобринского района И. Мороз подарил архиву свои документы.

**Бакун, Е.** Где дело само за себя говорит / Елена Бакун // Кобрынскі веснік. - 2017. - 5 красавіка. - С. 5. - Почетный гражданин Кобринского района И. П. Мороз прошел путь от рядового техника-механика до управляющего предприятия.

### *65 гадоў з дня нараджэння А. А. Мельнікава (1960)*

**Мельнікаў Аляксандр Аляксандравіч** (1960-1986). Прапаршчык. Нарадзіўся 16 лістапада 1960 г. у в. Дубрава Петрыкаўскага раёна Гомельскай вобласці. У 1976 г. закончыў 8 класаў СШ № 2 г. Кобрына, у 1979 г. – Белаазёрскае ПТВ № 82. Пасля тэрміновай службы працаваў мантажнікам у міжкалгасным сельскім будаўнічым камбінаце г. Кобрына. У 1985 г. зноў звязаў свой лёс з арміяй. Прапаршчык А. А. Мельнікаў загінуў у Афганістане ў 1986 г. Пахаваны на могілках г. Кобрына. У музеі баявой славы СШ № 2 г. Кобрына А. Мельнікаву прысвечана экспазіцыя.

**Мельнікаў Аляксандр Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 446. - (Загінулі ў Афганістане).

**Мельнікаў Аляксандр Аляксандравіч** // Памяць. Афганістан. – Мінск, 1991. – С. 292.

### *120 гадоў з дня нараджэння С. К. Місюка (1905)*

**Місюк Сяргей Карпавіч.** Нарадзіўся ў 1905 г. у в. Дзевяткі. Да вайны жыў у в. Брылёва і працаваў на торфапрадпрыемстве «Брылёва». З красавіка 1942 г. да мая 1944 г. - радыст у партызанскім атрадзе імя Суворава брыгады імя Молатава Пінскага партызанскага злучэння, прымаў удзел у баявых аперацыях. Удзельнік вызвалення Кобрына ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны медалямі.

**Місюк Сяргей Карпавіч //** Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002.- С. 237 : фота. – (Яны вызвалялі Кобрыншчыну).

### *75 гадоў з дня нараджэння П. А. Міхайлава (1950)*

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** - дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка. Нарадзіўся 13 кастрычніка 1950 г. у в. Ушкавіца Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці. Аўтар больш за 140 навуковых і навукова-метадычных прац па разнастайных актуальных пытаннях сучаснай беларускай лінгвістычнай і метадычнай навукі. Ён вучоны сакратар савета па абароне дысертацый пры БДПУ імя Максіма Танка, член вучоных саветаў універсітэта і факультэта беларускай філалогіі і культуры.

**Дзятко, Д. В.** Міхайлаў Павел Аляксандравіч / Д. В. Дзятко, С. У. Шахоўская // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.] – Мінск, 2014. – Т. 5. - С. 597.

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 438. – (Імі ганарацца землякі).

**Міхайлаў Павел Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 99-101.

### *40 гадоў з дня нараджэння І. Ю. Міхуты (1985)*

**Міхута Ігар Юр'евіч**. Кандыдат педагагічных навук, дацэнт, дактарант дактарантуры Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. Танка. Нарадзіўся ў 1985 г. у г. Кобрыне. Выпускнік сярэдняй школы № 1 г. Кобрына. Скончыў факультэт фізічнага выхавання Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. Танка.

**Міхута Ігар Юр'евіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2017. – С. 102. : каляр. фота.

### *105 гадоў з дня нараджэння А. Д. Нікіціна (1920)*

**Нікіцін Аляксей Дзмітрыевіч** (1920-2000). Нарадзіўся ў 1920 г. ва Ульянаўскай вобласці, дзе бацькі былі ў бежанстве ў час Першай сусветнай вайны. У пачатку 1920-х гадоў сям’я вярнулася на Кобрыншчыну. У 16 гадоў стаў членам КСМЗБ, праз год - сакратаром ячэйкі. У 1939 г. прызначаны старшынёй рэўкама і членам сялянскага камітэта ў роднай вёсцы Акцябр, пазней загадваў пачатковай школай у в. Перавессе. У гады Вялікай Айчыннай вайны - камандзір разведвальна-дыверсійнай групы, якая выконвала заданні разведупраўлення Чырвонай арміі. Група базіравалася ў Грушаўскім лесе, падтрымлівала сувязь з Турнянскім антыфашысцкім камітэтам, партызанскім атрадам імя Кірава і падпольшчыкамі Кобрына. У ліпені 1944 г. група і яе камандзір удзельнічалі ў вызваленні Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

**Нікіцін Аляксей Дзмітрыевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 223. - (Змагаліся ў тыле ворага).

### *110 гадоў з дня нараджэння М. Л. Падзілы (1915)*

**Падзіла Міхаіл Лаўрэнавіч** (1915-1992). Нарадзіўся 20.09.1915 г. у г. Чаркасы (Украіна). У чэрвені 1941 быў дэмабілізаваны ў Чырвоную армію, ваяваў у складзе 9-га гвардзейскага Адэскага знішчальнага авіяпалка, удзельнічаў у абароне Адэсы, Сталінграда, штурме Берліна. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вайны жыў у Кобрыне, працаваў начальнікам дарожнай арганізацыі.

**Падзіла Міхаіл Лаўрэнавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 244-245 : фота. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *65 гадоў з дня нараджэння І. П. Панасюка (1960)*

**Панасюк Іван Паўлавіч** - кандыдат філасофскіх навук, старшыня савета дырэктароў ААТ «Новасібірскколермет», старшыня праўлення беларускага культурна-асветніцкага цэнтра ў гонар святой Еўфрасінні Полацкай. Нарадзіўся Іван Панасюк 14 красавіка 1960 г. у в. Лелікава Кобрынскага раена. У 2004 г. І. П. Панасюк першым з грамадзян Расіі быў узнагароджаны беларускім медалём Францыска Скарыны. Узнагароду «За вялікі асабісты ўклад у культурна-асветніцкую дзейнасць, прапаганду духоўнай спадчыны беларускага народа ў Расійскай Федэрацыі» Івану Паўлавічу ўручыў асабіста Прэзідэнт Беларусі.

**Кунц, Н. З.** Панасюк Иван Павлович / Н. З. Кунц // Гордость кадетского братства: выпускники суворовских военных и нахимовских военно-морских училищ, добившихся государственной и общественной известности / Н. З. Кунц. - М., 2010. - С. 438, 439, 440.

**Панасюк Іван Паўлавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 107-110.

**Казакова, А.** Белорусский сибиряк / Анна Казакова // Кобрин-информ. - 2016. - 8 сентября. - С. 4, 5.

### *150 гадоў з дня нараджэння С. К. Паўловіча (1875)*

**Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч** (1875-1940). Кандыдат багаслоўскіх навук, беларускі грамадскі, культурна-асветны дзеяч, педагог, публіцыст. З'яўляецца адной з выдатных, але незаслужана забытых асобаў беларускага духоўнага асветніцтва. Нарадзіўся 13 верасня 1875 г. у в. Асавец Кобрынскага павета Гродзенскай губерні. Навуковец адыграў значную ролю ў пашырэнні пісьменнасці, асветы на роднай мове ў Заходняй Беларусі. Значнасць асобы С. К. Паўловіча ў тым, што па-першае, ён, міранін з тэалагічнай адукацыяй, шмат папрацаваў на ніве духоўнага асветніцтва беларусаў;

па-другое, ён як асветнік, клапаціўся пра тое, каб самыя шырокія колы насельніцтва, асабліва моладзь, спасцігалі асновы хрысціянскай веры. Памёр 16 верасня 1940 г.

**Вабищевич, А. Н.** Павлович Сергей Константинович / А. Н. Вабищевич // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2007. – Т. 5. - – С. 679.

**Ліс, А. С**. Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч / А. С. Ліс // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1975. - Т. 8. - С. 332.

**Ліс, А. С.** Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч / А. С. Ліс // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. – Мінск, 1987. – Т. 4. – С. 119, 120.

**Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч** // Беларуская ССР : кароткая энцыклапедыя : у 5 т. – Мінск, 1981. – Т. 5 : Біяграфічны даведнік. – С. 473, 474.

**Павлович Сергей Константинович** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. – Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. – Кн. 2. - С. 183.

**Паўловіч Сяргей Канстанцінавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 112-114.

### *105 гадоў з дня нараджэння І. А. Петруковіча (1920)*

**Петруковіч Іван Арсеньевіч** (1920-1944)**.** Нарадзіўся ў 1920 г. у в. Баршчы Кобрынскага раёна. З першых дзён Вялікай Айчыннай вайны стаў падпольшчыкам. Потым дзейнічаў у партызанскім атрадзе. На яго рахунку было 19 узарваных варожых эшалонаў і шмат гітлераўцаў. У ноч на 13 чэрвеня 1944 г. на чыгуначнай станцыі Тэўлі на лініі Брэст-Мінск ён рыхтаваўся да падрыву чарговага варожага эшалона, але быў заўважаны і акружаны. Гітлераўцы хацелі ўзяць Петруковіча ў палон жывым, але ён узарваў снарадам сябе і ворагаў. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Леніна.

**Петруковіч Іван Арсеньевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 224. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *105 гадоў з дня нараджэння Р. М. Пракоўскага (1920)*

**Піракоўскі Рыгор Мікітавіч.** Нарадзіўся 25.01.1920 г. у в. Наваселіца Жытомірскай вобласці (Украіна). Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны прызваны ў Чырвоную армію, служыў у часці, якая размяшчалася паблізу Брэста. З 1943 г. у партызанскім атрадзе імя Чапаева брыгады імя Чапаева, быў палітруком роты. Узнагароджаны медалямі. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў з ліпеня 1944 г. працаваў загадчыкам агульнага аддзела райвыканкама. У 1945-1948 гг. - настаўнік Імянінскай пачатковай школы, потым дырэктар школы ў в. Кустовічы.

**Піракоўскі Рыгор Мікітавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 245. – (Крутымі дарогамі вайны).

### *100 гадоў з дня нараджэння П. Я. Плотка (1925)*

**Плотка Пётр Якаўлевіч.** Нарадзіўся 6 жніўня 1925 г. у в. Любашава Ганцавіцкага раёна Брэсцкай вобласці. Закончыў Гомельскі педагагічны інстытут імя В. П. Чкалава (1954). У Вялікую Айчынную вайну ў 1944-1945 гг. на 1-м Беларускім фронце. З 1946 г. інструктар, першы сакратар Ганцавіцкага райкама ЛКСМБ. У 1950-1957 гг. загадчык Ганцавіцкага, Жабінкаўскага раёна. Працаваў намеснікам старшыні райвыканкама і сакратаром Антопальскага райкама КПБ. У 1959-1962 гг. старшыня калгаса «Новы шлях» (в. Гарадзец Кобрынскага раёна). З 1962 г. па 1965 г. - старшыня, намеснік старшыні Кобрынскага райвыканкама. З 1965 г. - старшыня раённага камітэта народнага кантролю, з 1976 г. дырэктар, з 1985 г. настаўнік гісторыі сярэдняй школы № 5. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І ступені (1985), Чырвонай Зоркі, медалямі.

**Плотка Пётр Якаўлевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002.- С. 454 : фота. – (Яны кіравалі горадам і раёнам).

**Плотка Пётр Якаўлевіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 70. : фат.

## *170 гадоў з дня нараджэння Я. А. Рагоўскага (1855)*

**Рагоўскі Яўген Аляксандравіч** (1855-1923). Фізік і метэаролаг, прафесар Пецярбургскага і Харкаўскага ўніверсітэтаў. Нарадзіўся ў 1855 г. у г. Кобрыне Гродзенскай губерні. Навуковыя працы, якія друкаваліся ў «Журнале Рускага фізіка-хімічнага таварыства», «Nature», «Astron. Nahhrichten» і інш., прысвечаны такім пытанням, як будова зямной атмасферы, тэмпература і склад атмасферы Сонца і планет, сонечная радыяцыя, кінетычная тэорыя газаў. Вучоны праводзіў фотаметрычныя назіранні.

**Гапоненка, В. А.** Рагоўскі Яўген Аляксандравіч / В. А. Гапоненка **//** Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2001. - Т. 13. - С. 202.

**Рагоўскі Яўген Аляксандравіч** // 250 асоб з Беларусі у дыялогах культур : даведачнае выданне / рэд.: Т. Л. Пісарэнка, Л. У. Языковіч. – Мінск, 2008. – С. 77, 78.

**Рагоўскі Яўген Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 117-119.

## *100 гадоў з дня нараджэння М. С. Сакалюка (1925)*

**Сакалюк Мікалай Сцяпанавіч.** Нарадзіўся ў 1925 г. у в. Верхалессе*.* Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Пасля вайны працаваў загадчыкам хаты-чытальні, старшынёй Верхалескага сельсавета, старшынёй раённага камітэта ДТСААФ. З 1953 г. старшыня калгаса «Новае жыццё». Узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, Чырвонай Зоркі, Леніна (1966).

**Сакалюк Мікалай Сцяпанавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 428. – (Вызначыліся працай).

**Сакалюк Мікалай Сцяпанавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 23: фат.

## *125 гадоў з дня нараджэння А. Ц. Салея (1900)*

**Салей Андрэй Цімафеевіч** нарадзіўся ў 1900 г. у в. Балота Кобрынскага раёна. Вялікая Айчынная вайна застала яго ў в. Павіцце. У 1943-1944 гг. быў сувязным партызанскага атрада імя Катоўскага, збіраў і перадаваў партызанам звесткі пра дыслакацыю акупантаў і зброю. Узнагароджаны медалямі.

**Салей Андрэй Цімафеевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 225 : фота – (Змагаліся ў тыле ворага).

## *125 гадоў з дня нараджэння Л. М. Сандалава (1900)*

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** (1900-1987). Нарадзіўся 10 красавіка 1900 г. у г. Вічуга Іванаўскай вобласці (Расія). Удзельнік баёў на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну. Генерал-палкоўнік (1944). У пачатку Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у абарончых баях у раёне Брэста, Жабінкі, Кобрына і інш. У 1941-1945 гг. - начальнік штаба Бранскага, 2-га Прыбалтыйскага, 4-га Украінскага франтоў. Да 1953 г. на камандных пасадах у Савецкай арміі. Аўтар кніг «Пагарэла-Гарадзішчанская аперацыя» (1960), «Цяжкія

рубяжы» (1965), «Перажытае» (1966), «На маскоўскім напрамку» (1970), «Пасля пералому» (1983). Памёр 23 кастрычніка 1987 г.

**Долготович, Б. Д.** Сандалов Леонид Михайлович / Б. Д. Долготович // Почётные граждане белорусских городов / Б. Д. Долготович. - Минск, 2008. – С. 32.

**Сандалов Леонид Михайлович** // Большая советская энциклопедия : [в 30 т.]. – М., 1975. – Т. 22. - С. 557.

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 14. - С. 147.

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 139-140 : фота.

**Сандалаў Леанід Міхайлавіч** // Імі ганарыцца Кобрыншчына. Ганаровыя грамадзяне кобрынскага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; камп'ютарны дызайн вокладкі : інжынер-праграміст П. С. Грыневіч. – Кобрын, 2018. – С. 25-27 : каляр. іл.

### *55 гадоў з дня нараджэння Т. М. Саўчук (1970)*

**Саўчук Таццяна Мікалаеўна** - вучоны, кандыдат філалагічных навук, дацэнт Мінскага інстытута кіравання. Нарадзілася Таццяна Саўчук у 1970 г. у г. Кобрыне**.** Галіны мовазнаўства, у якіх працуе і можа выступаць у якасці эксперта, апанента: камунікатыўная лінгвістыка, прагмалінгвістыка, лінгвістыка тэксту, культура мовы, стылістыка.

**Саўчук Таццяна Мікалаеўна** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Саўчук Таццяна Мікалаеўна** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 119.

### *125 гадоў з дня нараджэння М. А. Саўчука (1900)*

**Саўчук Міхаіл Андрэевіч** (1900-1982). Нарадзіўся 7 лістапада 1900 г. у в. Сухоўчыцы, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Брэсцкай вобласці. Пасля вайны на адміністрацыйнай і гаспадарчай рабоце. Памёр 25 жніўня 1982 г.

**Савчук Михаил Андреевич** // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Брестская область : в 2-х кн. – Минск, 2009. – Кн. 2. – С. 329.

**Саўчук Міхаіл Андрэевіч** // Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945 : энцыклапедыя. – Мінск, 1990. – С. 555.

### *85 гадоў з дня нараджэння М. А. Свідуновіча (1940)*

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч.** Доктар тэхнічных навук, прафесар, акадэмік Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі, прэзідэнт Расійска-Беларускай навукова-тэхнічнай асацыяцыі «Сумесныя праекты», віцэ-прэзідэнт асацыяцыі «Чарнобыль і экалогія» (ЗША). Нарадзіўся 29 красавіка 1940 г. у в. Дзівін**.** М. А. Свідуновіч чытаў лекцыі ў вядучых універсітэтах свету ў ЗША, Францыі, Вялікабрытаніі. Ён падпісваў міжнародныя кантракты з Балгарыяй, Чэхіяй. За апошні час М. А. Свідуновіч выканаў шэраг праектаў, якія звязаны з высокатэмпературнай перапрацоўкай металазмяшчальных адходаў. Ён адкрыў новы напрамак па ўплыву фулеронаў на ўласцівасці спецыяльных сталей і сплаваў. Член Савета фонда фундаментальных даследванняў Рэспублікі Беларусь, старшыня секцыі «Атрыманне і выкарыстанне плазмы» Савета Акадэміі навук Беларусі.

**Миляшкеіч, Я. Г**. Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч / Я. Г. Міляшкевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. – Мінск, 2002. – Т. 14. – С. 257.

**Свидунович Николай Александрович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. – Минск, 2008. – Т. 6. - – С. 589.

**Свидунович Николай Александрови**ч // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 1. - С. 334.

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 440. – (Імі ганарацца землякі).

**Свідуновіч Мікалай Аляксандравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 121-123.

### *100 гадоў з дня нараджэння М. Т. Свірыдзюка (1925)*

**Свірыдзюк Мікалай Тарасавіч.** Нарадзіўся 27 красавіка 1925 г. у в. Турная Кобрынскага раёна. У Вялікую Айчынную вайну з ліпеня 1941 г. член Турнянскага антыфашысцкага камітэта, потым сувязны партызанскага атрада імя Арлова брыгады імя Чапаева. Удзельнічаў у шэрагу баявых аперацый партызан супраць захопнікаў, вызваленні Кобрына. Мае ўзнагароды. Пасля вайны працаваў у органах унутраных спраў, загадчыкам аддзелаў камунальнай гаспадаркі, сацыяльнага забеспячэння Кобрынскага райвыканкама, старшынёй калгаса імя Жданава Кобрынскага раёна.

**Свірыдзюк Мікалай Тарасавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 225 : фота. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *105 гадоў з дня нараджэння М. П. Святлова (1920)*

**Святлоў Мікалай Пятровіч** (1920-1944). Нарадзіўся ў 1920 г. у в. Вдулі Воласаўскага раёна Ленінградскай вобласці. З 1940 г. у Чырвонай арміі, служыў стралком на 1-й пагранзаставе Брэсцкага пагранічнага атрада. Вялікую Айчынную вайну сустрэў на граніцы. У верасні 1942 г. стаў партызанам атрада імя Катоўскага, быў радавым, камандзірам аддзялення, памочнікам начальніка асобага аддзела атрада. 6 красавіка 1944 г. забіты гестапаўскім агентам. Пасмяротна ўзнагароджаны медалём «За адвагу».

**Святлоў Мікалай Пятровіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 225: фота. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *140 гадоў з дня нараджэння У. Д. Севасцьянава (1885)*

**Севасцьянаў Уладзімір Дзянісавіч** (1885–1956). Удзельнік грамадзянскай вайны, генерал-маёр юстыцыі (1943). Нарадзіўся ў 1885 г. у г. Кобрыне. Член КПСС з 1919 г. У Чырвонай Арміі са жніўня 1918 г. Удзельнік баёў на Паўднёвым фронце. З 1937 г. - намеснік ваеннага трыбунала Прыволжскай акругі, потым арміі. У Айчынную вайну - старшыня ваеннага трыбунала Асобнай Арміі і Ціхаакіянскага флоту. Пасля вайны старшыня ваеннага трыбунала Ціхаакіянскага і Ваенна-марскога гарнізона Ленінграда. З 1950 г. у адстаўцы. Узнагароджаны ордэнам Леніна, медалямі.

**Севасцьянаў Уладзімір Дзянісавіч** // Беларуская савецкая энцыклапедыя : у 12 т. – Мінск, 1973. – Т. 9. – С. 462.

**Севасцьянаў Уладзімір Дзянісавіч** // Новыя кнігі. - 2014. - № 9. – С. 12.

### *105 гадоў з дня нараджэння І. К. Семенюка (1920)*

**Семянюк Іван Карпавіч** (1920-1947**).** Нарадзіўся 25 чэрвеня 1920 г. у в. Стрыі ў сялянскай сям'і. Прымаў актыўны ўдзел у партызанскім руху, ваяваў у атрадзе імя Чапаева. Яго партызанская мянушка была Ванька Чорны. Пасля вызвалення Кобрынскага

раёна І. К. Семянюк працаваў намеснікам раённага ўпаўнаважанага. У лістападзе 1947 г. Семянюк загінуў ад бандыцкай кулі.

**Сушчук, А. М.** Вайна закончылася, а людзі гінулі / А. М. Сушчук // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка - Мінск, 2002. - С. 396 : фота.

### *105 гадоў з дня нараджэння С. Ф. Семенюка (1920)*

**Семянюк Стафан Фёдаравіч** (1895-1931). Нарадзіўся 3 снежня 1895 г. у в. Яромічы. Асобнай роты службы сувязі матрос 2-й ст. Стафан Семянюк на флоцкую службу прызываўся ва ўмовах царскай імперыі, а вярнуўся на Кобрыншчыну, калі ўжо ўсталявалася панаванне Польшчы. У далейшым - удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, вызваляў Польшчу ад гітлераўскіх акупантаў і быў паранены. Невядома, што абуджала ў Стафане Семенюку, што жывіла ў ім імкненне да паэтычнага слова. Невыпадкова ён адразу пайшоў вучыцца, калі пры Яроміцкай сельскай школе адкрыліся курсы для дарослых. С. Семянюк адгукаўся ў сваіх вершах на розныя праявы сялянскай рэчаіснасці. 17 мая 1931 г. на 36-м годзе жыцця памёр. Рана згас паэтычны дар, які так і не змог разгарнуцца ў поўную сілу.

**З вершаў** С. Семенюка // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 119.

**Сушчук, А.** Ен валодаў паэтычным дарам / А. Сушчук // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 118-119.

**Семенюк, С.** Тяжка праца селян.. Ми ж хіба не народ? : стихи / Степан Семенюк // До тебе, світе...: українська література Берестейщини. – Київ, 2003. - С. 146-147.

**Степан Семенюк** (1895-1931) // До тебе, світе..: українська література Берестейщини. - Київ, 2003. - С. 144-145.

### *85 гадоў з дня нараджэння У. А. Семенюка (1940)*

**Семянюк Уладзімір Андрэевіч** - беларускі філосаф, палітолаг, доктар філасофскіх навук (1990), прафесар (1993). Нарадзіўся 16 лістапада 1940 г. у в. Залессе Кобрынскага раёна. У. А. Семянюк – прафесар кафедры «Философские учения» факультэта тэхналогій кіравання і гуманітарызацыі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта. Галоўныя навуковыя працы: «Хрысціянскі гуманізм» (1969), «Сіянізм у палітычнай стратэгіі імперыялізму» (1981) і інш.

**Семянюк Уладзімір Андрэевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 440-441 : фота. – (Імі ганарацца землякі).

**Семянюк Уладзімір Андрэевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 125-126.

### *105 гадоў з дня нараджэння М. Ф. Сідарука (1920)*

**Сідарук Максім Фёдаравіч.** Нарадзіўся ў 1920 г. у в. Корчыцы. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Славы ІІ і ІІІ ступеней, ордэнам Айчыннай вайны, 2 ордэнамі Чырвонай Зоркі. Пасля вайны працаваў кавалём у калгасе «Сцяг Перамогі» Кобрынскага раёна. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1978).

**Сідарук Максім Фёдаравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 428. - (Вызначыліся працай).

**Сідарук Максім Фёдаравіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 23-24: фат.

### *35 гадоў з дня нараджэння А. В. Сінчука (1990)*

**Сінчук Алег Віктаравіч.** Навуковец-біёлаг, аспірант, асістэнт кафедры заалогіі біялагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (БДУ). Нарадзіўся 21 мая 1990 г. у в. Верхалессе Кобрынскага раёна. Вобласць навуковых інтарэсаў А. Сінчука: фауна, біялогія і экалогія расліннаедных і грамадскіх насякомых (Insecta: Hymenoptera: Formicidae) Беларусі, асновы біятэхналогіі. Агульная колькасць публікацый маладога навукоўца - больш 20.

**Елизарова, Ж.** Профессия – энтомолог / Жанна Елизарова // Кобрынскі веснік. – 2017. – 23 верасня. – С. 9.

**Сінчук Алег Віктаравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 128-129.

### *125 гадоў з дня нараджэння Г. Г. Смольскага (1900)*

**Смольскі Гардзей Георгіевіч.** Нарадзіўся ў 1900 г. у в. Паляцічы. З 1923 г. член КПЗБ. Удзельнічаў у стварэнні камуністычных ячэек у Паляцічах і Кобрыне. З 1923 г. сакратар райкама, з 1925 г. член часовага сакратарыята Віленскага і Брэсцкага акругкамаў КПЗБ. У 1926 г. арыштаваны і прыгавораны да 4 гадоў зняволення. Пасля выхаду з турмы прымаў удзел у арганізацыі выступленняў рабочых гарбарных і дрэваапрацоўчых прадпрыемстваў, батракоў і інш. У Вялікую Айчынную вайну сувязны партызанскіх атрадаў імя Чапаева і імя Арлова брыгады імя Чапаева.

**Смольскі Гардзей Георгіевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 115-116 : фота. - (Удзельнікі рэвалюцыйных выступленняў на Кобрыншчыне. 1921-1939).

### *225 гадоў з дня нараджэння А. Д. Сузіна (1800)*

**Сузін Адам Дамінікавіч** (1800-1879). Магістр філасофіі, этнограф, падарожнік, даследчык-натураліст. Нарадзіўся 10 студзеня 1800 г. у маёнтку Кулігоўшчына Кобрынскага павета Гродзенскай губерні. У беларускую свядомасць гэту неардынарную асобу вярнуў гісторык Валянцін Пятровіч Грыцкевіч. Пра Адама Сузіна можна гаварыць не толькі, як пра рэвалюцыянера, але і як падарожніка, даследчыка-натураліста, этнографа. Памер 11 снежня 1879 г.

**Грыцкевіч, А.** Сузін Адам / Анатоль Грыцкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. - Мінск, 2001. - Т. 6, кн. 1. - С. 443.

**Грицкевич, А. П**. Сузин Адам / А. П. Грицкевич // Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 1. Брестская область : в 2 кн. - Минск, 2009. - Кн. 2. - С. 391.

**Грицкевич, В. П.** В степи за Илеком / В. П. Грицкевич // От Немана к берегам Тихого океана / В. П. Грицкевич. – Минск, 1986. – С. 132-148.

**Марціновіч, А.** Адам Сузін / Алесь Марціновіч // Гісторыя праз лёсы. Т 8 / Алесь Марціновіч. – Мінск, 2020. – Кн. 1. - С. 8-29.

**Сузін Адам Дамінікавіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 139-141.

### *100 гадоў з дня нараджэння А. М. Сушчука (1925)*

**Сушчук Аляксей Міхайлавіч.** Нарадзіўся 8 мая 1925 г. у в. Кустовічы. З 1943 г. сувязны партызанскага атрада імя В. І. Чапаева. Са жніўня 1944 г. у Чырвонай арміі, з лістапада 1944 г. да мая 1945 г. прымаў удзел у ваенных дзеяннях. Пасля дэмабілізацыі працаваў дырэктарам кінафікацыі Кобрынскага раёна, загадчыкам аддзела культуры

Кобрынскага райвыканкама, дырэктарам гарпалівазабеспячэння. Закончыў завочна Вышэйшую партыйную школу (1970). На працягу доўгіх гадоў супрацоўнічаў з рэдакцыяй газеты «Кобрынскі веснік», аўтар шматлікіх артыкулаў. З 1990 г. і да апошняга дня працаваў памочнікам-сакратаром дэпутата Вярхоўнага Савета, потым Нацыянальнага сходу Беларусі В. Ф. Кучынскага. Удзельнік юбілейнага парада Перамогі на Краснай плошчы ў Маскве 9 мая 1995 г. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, медалямі «За доблесную працу», «Ветэран працы», Ганаровай граматай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь.

**Сушчук Аляксей Міхайлавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 245-246 : фота. – (Крутымі дарогамі вайны).

**Пустовой, Е**. Солдат эпохи / Е. Пустовой // Кобрин-информ. – 2005. – 25 августа. – С. 3. - К 80-летию А. М. Сущука.

### *80 гадоў з дня нараджэння А. С. Ткачука (1945)*

**Ткачук Антон Сцяпанавіч** (1945-2015). Нарадзіўся 7 студзеня 1945 г. у в. Жыдче Пінскага раёна Брэсцкай вобласці. У 1968 годзе закончыў Беларускі інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі па спецыяльнасці «інжынер-механік». З ліпеня 1968 г. па ліпень 1970 г. працаваў загадчыкам рамонтнымі майстэрнямі аддзялення «Сельгастэхніка» ў в. Дзівін Кобрынскага раёна. Шаснаццаць гадоў (з лютага 1981 г. па люты 1997 г.) узначальваў саўгас «Днепра-Бугскі». На працягу шасці гадоў з ліпеня 1997 г. па сакавік 2003 г. працаваў старшынёй Дзівінскага сельскага Савета дэпутатаў. За шматгадовую добрасумленную працу А. С. Ткачук узнагароджаны медалём «За доблесную працу», двума ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, шэрагам грамат. Памёр 9 чэрвеня 2015 г.
У 2016 г. у пасёлку Арэхаўскі адбыўся мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнай дошкі памяці першага кіраўніка саўгаса «Днепра-Бугскі».

**Ткачук Антон Сцяпанавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 77-78. : фат.

**Пашковіч, Л.** Добрая праца не забываецца / Людміла Пашковіч // Кобрынскі веснік. - 2016. - 9 студзеня. - С. 1. - У пасёлку Арэхаўскі адбыўся мітынг, прысвечаны адкрыццю мемарыяльнай дошкі памяці першага кіраўніка саўгаса "Днепра-Бугскі" Антона Ткачука.

### *95 гадоў з дня нараджэння Ф. М. Торгуна (1930)*

**Торгун Фёдар Маркавіч**. Нарадзіўся ў 1930 г. у в. Варатынічы. Пасля службы ў радах Савецкай арміі пачаў працаваць у сістэме Кобрынскага райспажыўсаюза. Узнагароджаны ордэнам Леніна (1971), іншымі ўзнагародамі.

**Торгун Фёдар Маркавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 428. – (Вызначліся працай).

**Их доблестный** труд отмечен орденом Ленина. **Фёдор Маркович Торгун** // Они награждены орденом Ленина : альбом. – Кобрин, 1981.

**Торгун Фёдар Маркавіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 25 : фат.

### *105 гадоў з дня нараджэння І. С. Хаменка (1920)*

**Хаменка Іван Сяргеевіч.** Нарадзіўся ў 1920 г. у с. Скапцы (Васялінаўка) Барышаўскага раёна Кіеўскай вобласці. Закончыў Севастопальскае ваеннае зенітнае вучылішча. У гады Вялікай Айчыннай вайны ўдзельнічаў у стварэнні партызанскай групы, якая разам з іншымі аб'ядналася ў атрад імя Шчорса. У красавіку 1943 г. - начальнік

штаба атрада імя Катоўскага. Узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі. Пасля вызвалення Беларусі ад фашысцкіх захопнікаў працаваў у г.п. Антопаль.

**Хаменка Іван Сяргеевіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 218. - (Арганізатары і кіраўнікі партызанскага руху на Кобрыншчыне).

### *100 гадоў з дня нараджэння Б. М. Шварко (1925)*

**Шварко Барыс Максімавіч** (1925-1988). Нарадзіўся 2 жніўня 1925 г. у в. Балоты. У Вялікую Айчынную вайну ваяваў у складзе 429-га мінамётнага палка камандзірам мінамётнага разліку. Удзельнічаў у вызваленні Будапешта і Прагі. Узнагароджаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны I ступені, медалямі.

**Шварко** Барыс Максімавіч // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 246 : фота. – (Яны прайшлі дарогамі вайны).

### *105 гадоў з дня нараджэння С. І. Шварко (1920)*

**Шварко Сямён Іванавіч**. Нарадзіўся ў 1920 г. у в. Балоты. У 1942-1943 гг. быў сувязным камсамольскага падполля з партызанамі. У маі 1943 г. пайшоў у партызанскі атрад імя Катоўскага, актыўна ўдзельнічаў у дыверсійнай барацьбе. Пасля вызвалення Кобрыншчыны ад фашысцкіх захопнікаў накіраваны на службу ў органы НКУС і праслужыў там да выхаду на пенсію. Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

**Шварко Сямён Іванавіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. – С. 227 : фота. – (Змагаліся ў тыле ворага).

### *85 гадоў з дня нараджэння М. Д. Юшчука (1940)*

**Юшчук Мікалай Дзмітрыевіч** - доктар медыцынскіх навук, прафесар, акадэмік Расійскай акадэміі медыцынскіх навук (РАМН), лаўрэат прэміі Урада Расійскай Федэрацыі, заслужаны дзеяч навукі Расіі. Нарадзіўся 22 снежня 1940 г. у в. Авады Кобрынскага раёна. Аўтар больш за 600 навуковых прац, вядомы вучоны з сусветным імем. Ён унёс вялікі ўклад у вывучэнне патафізіялогіі і распрацоўцы метадаў тэрапіі розных інфекцыйных хвароб. Пад кіраўніцтвам Мікалая Дзмітрыевіча праводзіцца вывучэнне малекулярна-біялагічных тэхналогій у дыягностыцы вірусных гепатытаў.

**Юшчук Мікалай Дзмітрыевіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2017. – С. 156-158.

**Юшчук Мікалай Дзмітрыевіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 143-144 : фат.

**Савчук, М.** Дело всей жизни ученого Ющука / Маргарита Савчук // Кобрин-информ. – 2010. – 28 января. – С. 6.

**Юбилей** академика РАМН Николая Дмитриевича Ющука : к 70-летию со дня рождения // Российский журнал Гастроэнтерологии, Гепатологии, Колопроктологии. – 2010. – Т. 20. - № 6. – С. 86-87.

# Юбілейныя даты рэлігійных устаноў горада і раёна

### Свята-Спаскаму манастыру ў г. Кобрыне (1465) – 560 гадоў

Найбольш старажытным помнікам праваслаўнага царкоўнага будаўніцтва з'яўляецца **Свята-Спаскі манастыр** у Кобрыне. Размешчаны на вуліцы 17 Верасня, 11 (былая Базыльянская), на левым беразе р. Мухавец. Упершыню ўпамінаецца ў 1465 г. як мужчынскі манастыр. Вядома, што манастыр быў створаны па ініцыятыве апошняга кобрынскага князя Івана Сямёнавіча. Доўгі час у будынку манастыра працаваў Кобрынскі раённы аддзел унутраных спраў. У сённяшні час па благаславенні Сінода Беларускай Праваслаўнай Царквы манастыр адраджаецца, але ўжо як жаночы манастыр Усяміласцівага Спасу. Галоўная мясцовая святыня - цудатворная ікона Божай Маці «Скарапаслушніца», створаная спецыяльна для манастыра на святой гары Афон. Спаскі манастыр уваходзіць у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Вярнуўшыся пад юрысдыкцыю царквы, гэты старадаўні куток Кобрына не страціў свой багаты турыстычны патэнцыял, прывабнасць для вандроўцаў самых розных канфесій, бо з ім злучана шмат гістарычных падзей.


**Барысюк, Ю. А.** Свята-Спаскі манастыр / Ю. А. Барысюк // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. - Мінск, 2002. - С. 460-461. - (Праваслаўнае мураванае дойлідства).

**Кобрынскі** Спаскі Манастыр // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. – Мінск, 1997. – Т. 4. - С. 222.

**Кулагін, А.** Свята-Спаскі манастыр / А. Кулагін // Праваслаўныя храмы Беларусі : энцыклапедычны даведнік / А. Кулагін. – Мінск, 2007. – С. 202-203.

**Мешечко, Е. Н.** Во имя Всемилостивого Спаса женский монастырь / Е. Н. Мешечко // Путешествие по Беларуси. В краю Нёмана, Западного Буга и Припяти : путеводитель. – Брест, 2012.- С. 140.

